*Станіслаў Грынкевіч*



KAMUNIKAT.org

# *Зацемкі*

# З роднае Сакольшчыны

Хацеў-бы з нагоды кніжкі інж. Крыштофіка* зьвярнуць увагу беларускага грамадзянства на Сакольшчыну. Трэба сказаць з сумам, што рознаякія ўмовы і абставіны апошніх некалькінаццаці гадоў быццам пакінулі Сакольшчыну, Аўгустоўшчыну, ды і адчасьці Беласточчыну за лагвом нашага нацыянальнага жыцьця і змаганьня. Сяньня шмат хто, на'т і з передавое інтэлігенцыі, заглядаецца на менаваныя тэрыторыі, як на мёртвую пазыцыю нашага нацыянальнага чалавечага, інтэлектуальнага і гаспадарчага білянсу, калі яны якга павінны быць дзейным жывым капіталам.

Да вайны бачылі мы ў Сакольшчыне адныя з першых спробаў масавае акцыі нацыянальнае сярод сялянства. Ці гэта былі паасобныя выезды сяброў Горадзенскага гуртка моладзі на вёску з мэтаю распаўсюджваньня сьведамасьці, ці гэта былі выезды тэатральнае трупы вышменаванае арганізацыі – усё гэта будзіла і клікала народ да новых, лепшых дзён і Сакольшчына шырока адгукнулася. З Сакольшчыны родам, сяньня забыты, хаця жывы яшчэ, аўтар сапраўды філёзофічнае, адначасна вельмі простае і практычнае кніжкі пчалярскае, вядомы пад мянюшкаю Г. Бярозкі (Кс. Г. Бэтто). З гэтуль родам Кс. Фр. Грынкевіч – пачынальнік вельмі новачасна наладжанае працы паміж моладзьдзю. Сярод Сакольцаў бачым перадавую жанчыну ў нашым грамадзянстве Л. Войцічыху ды шмат, шмат яшчэ іншых людзей...

Вайна перабазавала пункты апоры працы беларускае на новых мясцох і Сакольшчына заглохла, казаў-бы нехта – дзірваном парасла. Зрух у пару Грамады скрануў быццам часткова і расьцярушыў нейкую дрымоту. Аднак не надоўга. Глядзельнік сяньня звонку ня бачыць тае руні беларускае, якая буйна паўсходзіла пару дзесяткаў гадоў таму назад.

Аднак і пасьля вайны вёска ў Сакольшчыне змагаецца за свае правы, імкнецца да асьветы ў роднай мове, робіць спробы наладзіць свае школы. Паказальнікам сьведамасьці можа быць адчасьці распаўсюджаньне прэсы. Дзеля арыентацыі зьвярну ўвагу на такі ма-

* Inż. Krysztofik. „Jasienówka — wieś powiatu Sokólskiego”. Poznań.1934.

мэнт, што ў аднэй з воласьцяў на пошту прыходзіла каля 50 экзэмпляраў прэсы палітычнае розных напрамкаў, органаў гаспадарчых і г. д. Колькасьць, бяручы яе ў самой сабе, мо' і невялікая, аднак для нашых умоў яна многагаворачая. Пасьля ведамае, няслаўнае забароны арцыб. Ялбжыкоўскага, колькасьць чытачоў меншае да 10 прац. Не напалохаліся ксяндзоўскіх праклёнаў толькі праваслаўныя. Усё-ж і на іх знайшліся спосабы, і сяньня беларускі друк рэгулярны ў Сакольшчыне справа ня лішне частая.

Беларуская арганізаваная работа ідзе там і сяньня, толькі мае йнакшы характар, інакшую тактыку, чымся ў другіх раёнах. Дзеля гэтага і наш падыход і адносіны да людзей і тэрыторыі мусяць быць іншыя. Першым крокам да таго — ведаць народ, ведаць псыхолёгію мясцовую. Сакольшчыну сяньня трэба нам вывучыць, ня трэба аб ёй забывацца.

* * *

Монографія Крыштофіка цікуе аб адной толькі вёсцы, да таго-ж з заходняе часткі павету Сакольскага. Аўтар маніцца прадставіць толькі зямельную праблему ў гістарчным аспэкце, аднак сабраў столькі цікавага матарыялу гістарычнага, эканамічнага, соцыяльнага, бытавога на шырокай асноведзі псыхолёгічнай, што гэта дае нам магчымасьць пазнаёміцца ня толькі з адною вёскаю, а з цэласьцю гэнае тэрыторыі.

Насельніцтва тутака мае шмат асаблівасьцяў. Да XIV стагодзьдзя зямля тутака заселена Яцьвягамі. Толькі пад канец XIV стагодзьдзя прыходзяць каляністыя і, наколькі можна судзіць з прозвішчаў, каляністыя ідуць з усходу. Гэта тэрыторыя экспансіі беларускае. Прозьвішчы сучасныя Клімушко, Цэрэшко, Аўсейко, Карпеня, Сапко, Кулак, Крагель, Андрэйчык і г. д. паказваюць на чыста беларускае іх паходжаньне. Прозьвішчы такія, як Ровдэлі, Жымелі, Шыпіто, Сампляс, Кімшало, Шаргяло і г. д. — што шмат іншае крыві — яцьвяскае ды літоўскае — улілося і зьмяшалася са славянскаю — беларускаю. Ёсьць магчыма і сьляды татараў. Родная мова насельніцтва, як аўтар лёяльна пацьвярджае, — беларуская. Мова ваколіцаў Ясяноўкі крыху мягчэйшая. Найбольш ярка бачым гэта ў такіх формах, як „сьмецьця"... „бярэцьця" і т. п. Веравызнаньне мяшанае, з большасьцю каталікоў. Суадносіны паміж вернікамі розных веравызнаньняў добрыя, ня гледзячы на ўсякія падзеі ў мінуўшчыне ды сучаснасьці. Яшчэ дасюль прымета канфэсыйная: „вера руская

і польская" — зьяўляюцца лініяю падзелу ў шмат якіх галінах грамадзкага жыцьця.

Ясяноўка — характэрны прыклад долі ці лепш нядолі нашага народу. У XVII стагодзьдзі жыло ў вёсцы 31 семьяў — каля 255 душ. У XVIII стагодзьдзі было толькі каля 90 жыхароў. З раней асеўшых людзей мала хто астаўся, сустракаем у сьпісах усё новыя прозьвішчы. Розныя войны дзяржаўныя і „няціхоты" хатнія паміж панамі, розныя пошасьці пакідалі парожнія вёскі, а народ нейдзе прападаў. Сьлед пасьля такіх войнаў быў заўсёды пэўны адзін, што работа на землях каралеўскіх ці панскіх аставалася меншай колькасьці людзей. Галіта прыганятых, культурная адсталасьць — гэта прыметы, без якіх ня можна сабе ўявіць колішняга селяніна беларускага.

Не ўваходзячы ў прычыны, якія выклікалі акт 1861 года, канец паншчыны быў і ў Ясяноўцы пачаткам новае пары. Яшчэ ў 1823 годзе на 30 хатаў у вёсцы ў 14-ці жыло больш чымся 5 асобаў, а ў пяці хатах больш чымся 9 людзей. Яшчэ ў 1862 годзе толькі дзьве жанчыны маюць больш чымся 60 гадоў, няма ніводнае старэйшае за 70 гадоў. Хаты найчасьцей курныя, халодныя. З лесам у Сакольшчыне скупа ўжо ў пачатку XIX стагодзьдзя. З канцом прыгону — можна сказаць яркая перамена ва ўсіх галінах жыцьця. Праўда, за апошніх 40 гадоў мала павялічыўся лік насельніцтва ў вёсцы. Шмат народу йшло ў Амэрыку на эміграцыю. Эміграцыя з Сакольшчыны тым вызначалася, што вялікі працэнт эмігрантаў аставаўся назаўсёды ў чужой старане, з прычыны перанаселенасьці свае тэрыторыі. Сяньня на 1 кв. клм. жыве тутака 54 людзей, а сярэдне на адзінку выходзіць 1,85 гектара зямлі. Пры ніжэй сярэдняй якасьці зямлі, пры ніскай культуры земляробскай цяжка жыць. Эміграцыя не парывае лучнасьці са сваімі. Эмігранты сваім капіталам, ці лепш казаць, апошнімі грашамі, заробленымі на амэрыканскіх фабрыках, спрычыняюцца да амаль поўнае ліквідацыі буйнае ўласнасьці ў Сакольшчыне. Сяньня, можна казаць, панскіх двароў амаль што зусім няма ў Сакольшчыне.

Асьветы публічнае ў раёне Ясяноўкі да канца XIX стагодзьдзя ня было. Нармальную школьную акцыю бачым пачынаючы толькі з 1900 года. Да вайны дзяўчат у школу хадзіла вельмі мала. Хлапцы, і тыя, лучалі найчасьцей у паваротны анальфабэтызм. Прыватныя „школы" былі лепш наладжаны. Патрэба ўмець маліцца з кніжкі (папольску) вяла да таго, што кожная вёска мела свайго „дарэк-

тара", які вучыў дзяцей. Дырэктарам быў найчасьцей пастыр, які ўлетку ў той самай вёсцы гнаў авечкі ў поле. Ад пары да пары дырэктарам быў чалавек бывалы па сьвеце. Абойм навукі ў такіх прыватных школах быў абмяжованы і вуска „спэцыяльны". Найчасьцей вучань умеў чытаць выключна на сваёй кніжцы да набажэнства. Школьны прымус пасьляваенны паправіў сытуацыю. Сяньня Ясяноўка мае 35,3 прац. анальфабэтаў. Асьвета публічная пасьляваенная даволі аднабокая. Хопіць сказаць, што ў павеце няма ніводнае сельска-гаспадарчае школы, няма школы гандлёвае, няма ўмоваў да таго, каб моладзь магла знайсьці выхад з вёскі. Эміграцыі пасьля вайны няма. Пры комасацыі ўжо зробленай, ці якая сяньня рэалізуецца, няма ніякае гутаркі аб надзеле зямлёю. Няма скуль яе ўзяць. Пэрспэктывы эканамічныя вёскі на будучыню вельмі цяжкія. Перанаселенасць кліча аб патрэбе шырокіх плянаў і неадкладнае іх рэалізацыі.

Сьведамасьці нацыянальнае беларускае масавае няма. Няма затое ніякае іншае. Няма, можна казаць, і сьведамасьці палітычнае. Ясяноўка, як і ўся Сакольшчына, жджэ, быццам тая зачараваная каралеўна, свае пары і таго слова, якое скране да поўнага жыцьця. Дагэтуль народ жыве з дня на дзень, цікуючы аб вельмі дробных праблемах, ня выходзячы за межы свае вёскі ці парафіі. Народ ня верыць у свае сілы, глядзіць з недаверам на ўсё навакольнае. Змаганьне палітычных партыяў польскіх ня выклікае рэха. У найбольш гарачую пару калатні соймавых партыяў людзі кінуўшы картачку на адзін са шматлікіх нумароў больш ня цікавіліся, каго выбралі, які лёс сабе яны нарыхтавалі.

Дзівіцца ня будзем з такіх адносінаў. Народ вякамі стагнаўшы ў паняволеньні, прыгоне не перажыў патрэбнага ўздойму пачуцьцёвага, не ўяўляе рэальнасьці сучаснага палітычнага ладу. Аб адносінах да ўлады, аўтар гаворыць даслоўна: „могуць уладзе падпарадкавацца ці проці яе бунтавацца, не разумеюць яе"... (бачына 203).

З дзейнікаў, якія беспасярэдне ўплываюць на перамену такога становішча, аўтар спыняецца над школаю, асьветаю зашкольнаю і прэсаю. Нічога ня кажа аб адным яшчэ магутным дзейніку — касьцёле і царкве. Агулам, аўтар не дацэнівае ролі гэнных канфэсыйных установаў. Мы мусім сказаць, што шлях нармальнага разьвіцьця ўсіх чатырох дзейнікаў працуе на першы погляд проці нас. Будучыня пакажа, наколькі мы будзем жывучы ці наколь-

кі зможам працістaвіцца ў плошчы канкрэтнае саліднае работы культурна-асьветнае.

Народ у Ясяноўцы вельмі ашчадны. Ашчаднасьць між іншым праяўляецца ў шмат якіх хатніх абычаях, вопратцы, ежы і г. д. Церазпалосіца ад вякоў прымушае да канкрэтнага ладу жыцьцёвага. Аснаўным пасілкаваньнем будзе не абед, як гэта прынята ўсюды, а снеданьне. На абед было-б лішне далёка варочацца з поля да хаты, часта за 4-5 клм., дык гаспадыня варыць адзін раз раніцаю, а палуднуюць у полі. Лета — гэта аснаўны сезон, сьляды якога наглядаем у агульным ладзе хатнім і гаспадарчым.

Ашчаднасць дрэва, форма печак — вось яшчэ прычына такога, а ня іншага ладу. Кухня вельмі скромная і аднабокая. Стравы мала мяняюцца ў розных сезонах. Кухня багатых гаспадароў (багатым завецца ўласьнік 8-12 гектараў) аднолькавая з суседзямі бяднейшымі.

Форма гаспадаркі прымітыўная. Можна казаць, што лад заведзены валочнаю ўстановаю з 1557 года датрываў да нашых дзён. Сучасная комасацыя заводзіць новы лад, які ў шмат у чым розьніцца на лепшае ад таго, што было дагэтуль. Сяньняшні гаспадар розьніцца ад свайго прадзеда, што не гарэ валамі ды сахою, а карыстаецца плугам ды канём, што мае спранжыноўку замест ці побач дзераўлянае бараны ды мо' яшчэ тым, што сее лубін і сэрадэлю. Ясна, што і гэта поступ, толькі што як трохпалёўка заядала 100 і 200 гадоў, гэтак заядае яна і сяньня. Сыстэма гэная раўняла гледзячы на горшых і на горшае, а не на лепшых.

Рабочую вопратку шыюць з самадзелу. Сьвятам маладое пакаленьне апранаецца ў фабрычныя „гарнітары". Хусьця нацельнае і пасьцельнае сваё кужэльнае. Зьверхняя цёплая вопратка саматканая, са свае воўны, а кажухі са сваіх авечак.

Адным з характэрных рысаў у людзей, паводле аўтара, што быццам кідаецца ў вочы, — гэта малы культ традыцыі, нахіл прымаць усё чужое. Гэная свомасьць праяўляецца ў мове, абычаях, вопратцы ды агулам усюды. Гэтым аўтар хоча паясьніць, чаму Сакольшчына бедная песьнямі. Чужое, хай мала зразумелае, трымаецца, паводле яго, вельмі моцна, яно, думаюць, нейкае лепшае. Побач слоў выказваючых такі пагляд, гаворыць зараз далей, што ў важнейшых мамэнтах — вясельле, хрэсьбіны, памінкі і г. д. — толькі старадаўнія песьні здаволіваюць пачуцьцёвыя патрэбы народу. Новыя ні зьместам, ні рытмам, ні агульным характарам ня могуць

знайсьці тых нясьведамых, таёмных шляхоў, што адчыняюць душу і сэрца чалавека.

Лішне мала складаным прыдаецца аўтару характар людзей, калі ён робіць вывад з міралюбівасьці, лагоднасьці аб безхарактарнасьці. Аб прысутнасьці характару гаворыць вельмі красамоўна тое, што гэны народ астаецца верным сабе. Часта гэнае „сваё” яшчэ нявыяўлена, яшчэ не перажыта, агульна аднак стаіць на старожы якга ўсіх найважнейшых традыцыяў. Прысутнасьцю гэнага „нечага” можа паясьніць і „апалітычнасьць”, і „грамадзкасьць”, і тыя абыякавыя пагляды на навакольнае жыцьцё.

Аўтар гаворыць, што Ясяноўчане не салідарныя, што любяць яны пасьмяяцца адны з адных і г. д. Паклікаецца тутака на рознае этнічнае паходжаньне жыхараў, а адсюль ідзе нейкая расавая варожасьць.

Асабіста ведаю добра іншыя раёны Сакольшчыны, з тым самым складам насельніцтва, што ў Ясяноўцы. Не мог бы дзеля гэтага падзяліцца з Крыштофікам, каб этнічна розныя элемэнты былі дасюль нечым характэрным для Сакольшчыны. Суседзкія спрэчкі, калатні, часамі суды — гэта выплад абставінаў, у першую чаргу гаспадарчых, між іншым тае самае няшчаснае церазпалосіцы, якая мо' больш як дзе нязносная. Вёскі скамасаваныя, дзе такім чынам „высахлі” крыніцы спрэчак, — доказам добрых суседзкіх адносінаў.

* * *

Спыніўся я над некаторымі праблемамі з кніжкі інж. Крыштофіка. Як казаў я вышэй, аўтар цікаваў прадусім аб праблеме зямельнай і ў першае чарзе аб комасацыі і ейных сьледамках на зямлі і гаспадарцы. Сам Крыштофік сын вёскі, аб якой піша. Трэба сказаць, што найчасьцей добра ён яе разумее і хаця ўважае сябе за Паляка, умее шчыра і аб'ектыўна расказаць усё аб сваёй старане ад самае далёкае мінуўшчыны, наколькі дазваляе на гэта гістарычны матарыял. За праф. Шраммам, у якога пісаў сваю працу інж. Крыштофік, трэба згадзіцца, што асабліва беларусам пры складзе нашае нацыянальнае гаспадаркі зьяўляецца неабходнасьцю разбудова новае галіны — соцыёлёгіі сельскае гаспадаркі. А мы нажаль так вельмі мала ведаем аб сабе.

*1937 г.*

# З зацемак аб характары беларусаў

Нашая публіцыстыка даволі шмат ахвяравала месца пытаньню „дзьвёхдушнасьці" ці „двоедушнасьці". Пытаньне гэтае мае сваю пазыцыю і на бачынах літаратуры прыгожае ў прозе і паэзіі. Сяньня аднак, прынамся ў Заходняй Беларусі, некалькі вось ужо гадоў тэмы гэтае ніхто не чапае, думаю, што на нашым Усходзе яна таксама ня існуе. На гэта апошняе ёсьць свае, усім вядомыя прычыны.

„Дзве душы" — гэта толькі адна старана пытаньня з галіны дасьведаў псыхолёгічных і трэба думаць, што само зьявішча, у форме, у якой яно было абгаворана ў нашай літаратуры, мае толькі дачасны характар на аснове агульнага развою суцэльнасьці народу, хаця бязумоўна зьявішча вельмі характэрнае і важнае.

Ня думаю спыняцца над аналізаю „дзьвёхдушнасьці", яе прычынаў, асноваў, пэрспэктываў на будучыню, а хачу падчыркнуць, што тутака мы бачылі адну із спосабаў аналітычнага падыходу да праблемы нацыянальнага характару. Спробы-ж падыходу сынтэтычнага да гэнае стараны душы народу, насколькі мне вядома, надта нялікія. І трэба сказаць, што нялікасьць гэная шкодная ў першую чаргу для нас самых.

Іншая справа, ці ёсьць даволі „сырца", з якога можна было-б пабудаваць будыніну больш менш рэальную душы народу беларускага. Кажу аб сырцы, апрацаваным навукова. Хаця зьяўляецца адначасна думка, хутчэй пытаньне, поўнае сумліваў, ці сапраўды гэныя абразы духовага быту, пабудаваныя на канве фактаў сабраных дасьледчыкамі з галіны этнолёгіі, мовазнаўства, гісторыі і г. д. больш блізкія да таго, што зьяўляецца заўсёды нечым няўяўленым ды адначасна найважнейшым, а на што мы кажам „душа народу", ці мо' лепш яе бачаць у вагні натхненьня людзі, што завуцца песьнярамі-прарокамі...

Тое ўсё, што мы ведаем аб Беларусе, пакідаючы на старане анэкдотычны хутчэй тып мужычка хітруна, хаця і прыбітага бядою, загнанага ўсімі, замкнёнага ў сабе ці зноў апрача таго аснаўнога тону бядульлівасьці, распаўсюджанага і праслаўленага нашымі паэтамі нядаўніх дзён, — ясна, што не адказвае поўнаму абразу чалавека.

Дык калі сяньня і немагчыма нам даць поўнага нарысу аснаўных старон характару — гэнае свомасьці чалавека найважнейшае ў сэнсе вартасьці адзінкі ў плошчы практычнага дзеяньня яго ў жыцьці, усё-ж такі можна прабаваць уявіць тое, што магло быць зафіксаванае на бачынах беларускае характэролёгіі.

Папытаем, што гэта такое наагул характар?

Адказаў пачуем шмат. Возьмем хаця-б такі сказ Гётэ: „Жыцьцё чалавека – гэта ягоны характар"... Характар, знача, зьяўляецца тою найважнейшаю пружынаю, якая вызначае ўсе шляхі, якая дае аканчальна рэалізацыю тых ці іншых ідэалаў і ідэяў, якая робіць больш ці менш вартасным самое жыцьцё.

Абойм такога акрэсьленьня вельмі шырокі, адначасна аднак рэальна паказуе, што каб сказаць нешта аб характары адзінкі, дык трэба ўзяць ейнае жыцьцё ў цэласьці. Характар – гэта свомасьць вельмі сталая, хаця адначасна быццам цякомая. Характар, як кажа адзін з вядомых псыхіятраў і псыхолёгаў (Кронфэльд), гэта нарадзіны індывідуальнае апрычонасьці ў суадносінах адзінкі з жыцьцём. Інакш кажучы, характар — гэта індывідуальная праява рэакцыі на вонкавае дзеяньне. Ня будзем уваходзіць у спрэчкі паміж адумыслоўцамі, якая розніца паміж канстытуцыяю ў сэнсе псыхо-этнічнае асноведзі чалавецкага ці нацыянальнага „я", а тэмпэрамантам і характарам. Адно ясна, што тэза аб працяжнасьці лініі жыцьцёвае мае сваю вялікую тутака вагу. Гэта безумоўны факт, што бяз мінуўшчыны немагчыма нічога сказаць аб будучыні, як немагчыма добра ацаніць сучаснасьць. Гэныя ўсе праявы стульна злучаны паміж сабою.

Дык дасьледваючы беларускі характар, трэба нам зьвярнуцца да гісторыі і ў мінуўшчыні шукаць адказу на пытаньне. У гісторыі мы наглядна пабачым, што сапраўды гэнае нешта невагомае вызначае рэакцыю адзінкі і згуртаваньня большага ці меншага людзей.

Ігнат Абдзіраловіч у кніжцы „Адвечным шляхам" падчырківае аснаўную лінію характару беларускага народу, а мяноўна „ваганьне" паміж Усходам і Заходам. Гэнае ваганьне ня будзе хістаньнем паводле аўтара, гэным тэрмінам хоча ён назваць нейкую асаблівую собскую лінію, якое трымаюцца Беларусы на сваім шляху гістарычным. Ужо першы вучоны беларускі, д-р Франішк Скарына, вызначаўся тым, што духова не належаў да заходу ані да ўсходу, і гэта магло паказываць, што не здаволівала яго культура ні рымская ні візантыйская, ён шукаў свае арыгінальнае лініі. Адно цікаўнае з'я-

вішча трэба падчыркнуць у думках аўтаравых, што ваганьне, аб якім ён гаворыць, трэба разумець, як асаблівую кансэрватыўнасьць. Беларус неахвотна прымае новае, усёроўна, адкуль яно ідзе і хто яго прыносіць з сабою.

Другая рыса характару, якая кідаецца ў вочы, спыніўшысь на мамэнт толькі на падзеях гістарычных Беларусі, гэта ейная міралюбівасьць, антымілітарызм, як мы казалі-б сяньня. І вось антымілітарызм і кансэрватызм пакідаюць яркія сьляды ад самага раньняга жыцьця Беларусі, як асобнае псыхо-этнічнае адзінкі. Кансэрватызм — гэта свомасьць да некаторае граніцы агульна чалавецкая. Заўсёды можна судзіць аб чалавеку, якім ён будзе, мяркуючы паводле таго, якім ён быў дагэтуль. Рэвалюцыі мае кожны чалавек, аднак рэвалюцыя астаецца заўсёды рэвалюцыяю, значыцца нечым вынятковым, з чым трэба рахавацца пастолькі, паскольні. Сяньня маем ужо навучны грунт дзеля разуменьня гэнага кансэрватызму.

Беларусы, як адзінка дзяржаўная, выступаюць на арэну гістарычную даволі позна, хаця не пазьней, як іншыя славянскія пляменьні, асабліва славяне ўсходняе групы. Пляменьні, з якіх аканчальна вырас народ беларускі, значыцца Крывічы, Радзімічы, Дрыгавічы і Севяране, былі параскіданы сярод балотаў і лясоў, дык ня мелі быццам на першы пагляд ніякіх граніцаў і мелі яны іх адначасна ў гэных самых лясох і балотах, якія баранілі іх ад усялякіх навінак, што маглі лучыць з далёкага сьвету. Гэныя ўмовы геаграфічныя пакінулі, зразумела, сьледамкі на псыхіцы людзей. Тутака крыніца неспагаднасьці ўсяму новаму, неспагаднасьці хутчэй пасыўнае, дзеля таго, што ў гісторыі нашай нідзе не наглядаем больш яркага пратэсту. Гэта між іншым пакінула свае сьледамкі на ўсім, што толькі бачым у Беларусаў: у распарадкаваньні жыцьця ўнутранага і арганізацыі вонкавае, ці ў сэнсе рэакцыі на небясьпеку (вайна абаронная) ці імкненьня да карысьці (прыкладам вайна зачэпная).

Каб добра ацаніць павагу гэнага зьявішча, трэба ўмець глянуць на сваю гісторыю так, як яна была ў сапраўднасці, трэба мець свае „акуляры", каб добра бачыць. Мы лішне часта глядзімо вачыма дасьледчыкаў ці афіцыяльных гісторыкаў расейскіх ці польскіх. Возьмем прыкладам факт, як трэба ацаніць слабасьць дзяржаўную чыста беларускіх твораў з пары полацкае? Ці гэта была няўмеласьць арганізавацца самым? Чаму-ж тады гэныя самыя князі ў пару літоўска-беларускую нашае гісторыі ўмеюць гэтак складна і вясьці

войны і будаваць шырока культуру ў галіне правадаўства і пісьменства? Адказ на гэта знаходзім уявіўшы сабе, што маса беларуская заўсёды ўмела вясьці сваё арыгінальнае жыцьцё. Сям'я, вёска, грамада (як найніжэйшая адзінка адміністрацыйна-самаўрадавая) сталі заўсёды надта высока і новыя ўмовы з мамэнтам новага праваparadку пасьля скасаваньня паншчыны зноў выявілі, што лепш як дзе ў іншым месцы Расейскае Імпэрыі — этнаграфічная Беларусь умела правясьці распарадкаваньне валасное гаспадаркі.

Гэны вось антымілітарызм побач традыцыяналізму, як сяньня казалі-б, паясьняе нам тую эпоху сужыцьця ў камплексе Літоўска-Беларускае гаспадарсьцьвенасьці. Літоўскія князі сарганізавалі гэны новы дзяржаўны комплекс. Адначасна бачым мы крыху нечаканае зьявішча. Ліцьвіны заваявалі бяскроўна Беларусь, а Беларусы, быццам паняволеныя, пачынаюць кіраваць гэнаю дзяржаваю. Паясьніць гэта нехта хацеў-бы вышынёю культуры тагачаснае Беларусі і ніжэйшым роўням яе на Літве. Але ці гэтакі адказ можа нас поўнасьцю задаволіць? Некаторыя падзеі сучаснасьці, якія адбываюцца на нашых вачох, паказуюць, што не заўсёды вышэйшая культура перамагае ў жыцьці. Ня буду паклікацца на праслаўлены ўжо сказ аднаго з польскіх прэм'ер-міністраў аб ліквідацыі беларускага пытаньня ў працягу 50 гадоў. Сучаснасьць зьяўляецца найлепшым адказам на натугі полёнізацыйныя. Суадносіны паміж чужым элемэнтам і масаю беларускаю паказываюць, што гэны загнаны гаротнік селянін умее зашчапіць свой светапагляд, свае абычаі насланаму з культурнаю місіяю да яго асадніку.

Дык ёсьць тады ў нявыразнасьці „хістаньня" беларускага нейкая суцэльнасьць, сіла і трэба папытацца — ці гэта сапраўды нявыразнасьць, ці гэта мо' толькі іншыя адносіны да жыцьця? У гэтай сіле асыміляцыйнай ёсьцьмо' нешта, што мерыць трэба мерамі ня розуму, а катэгорыямі рэпрэзэнтаванымі ў паэзіі... Новая пара ў развою падзеяў гістарычных на тэрыторыі беларускай у сувязі ўжо з Польшчаю вызначаецца адыходам вярхоў грамадзянства, якія губляюць свой твар нацыянальны і ў працягу некалькі стагодзьдзяў прытуляюцца да чужое ім псыхікі мазурскае. Ясна, што гэта ня была суцэльнасьць нацыі беларускае, што адкалолася ад свайго камля, — маса, шырокія сфэры грамадзянства асталіся пры берагу гэнае хвалі. Ня гледзячы на гэта „панскія" сфэры, усе тыя вяльможы і магнаты, да канца Рэчы-паспалітае пачувалі сваю апрычонасьць.

Лішне далёкаю была псыхіка людзей, якія гаварылі на тую пару аднолькаваю моваю, значыцца польскаю, у Беларусі і ў Польшчы. Няма што ўжо казаць аб мяшчанстве і сялянстве.

Я не ўваходжу ў прычыны, якія выклікалі гэныя працэсы, ці яны былі абаснаваныя і на чым былі абаснаваныя. Безумоўна тутака, у гэнай плошчы матар'ялістычная дыялектыка магла-б трыумфаваць, яна паказала-б і даказала-б, што шляхта беларуская імкнулася да тых здабычаў сацыяльных і клясавых, якія мела на тую пару шляхта польская.

Цікавімся мы аднак зусім не аб тым. Мы хочам знайсьці толькі адказ на тое, чым зьяўляецца і якім зьяўляецца характар Беларуса не як адзінкі, а як народу. Дык адыход цэлае клясы народу мае свой тутака асаблівы зьмест. Пасыўныя адносіны масаў паказваюць дужа добра на характар полёнізацыі. Гэта быў выплад дзяржаўнае толькі палітыкі, а ніколі нейкае вышэйшасьці, перамогі багацейшае культуры. Што вышэйшасьць культурная мела ды мае ў такіх сытуацыях адноснае значэньне — паказвае хаця-б прыклад падзеяў на польскім Шлёнску. Вялікая і багатая культура нямецкая не магла перамагчы інэртных адносінаў польскага работніка і селяніна. Калі ўжо гутарка аб вышыні культураў, дык можна папытацца, дзе яна была большая ў XIV-XV стагодзьдзях — на Беларусі, з ейнымі жывымі і сьвежымі традыцыямі з Візантыі, ці ў сярэднявечнай тагачаснай Польшчы?.. Які настрой доўга яшчэ вітае сярод сполёнізаваных сфэраў шляхоцкіх — бачым яшчэ ў Міцкевіча, прарока новае польскае эры, у сказе: „Літва, зямелька родная"...

Прыходзіць падзел Польшчы. Дзеля вышэй прыведзеных прычынаў, зразумела, што гэны мамэнт не закрануў глыбей масаў беларускіх. Астаюцца яны чужыя на лёзунгі інтэлігенцыі польскае ці расейскае, якія хадзілі ў народ з рознымі заклікамі. Селянін беларускі не лавіў паўстанцаў у 1863 годзе, як гэта было нат' мясцамі ў каранной Польшчы. Мясцамі ён спагадна паглядаў на натугі шляхты прагнаць маскалёў, найчасьцей аднак аставаўся інэртным. Усё гэта ня была ягоная справа. Правадыры тагачаснасьці ішлі да народу з лёзунгамі далёкімі і чужымі, што ня ўмелі закрануць душы. Тыя правадыры і народ ня мелі супольнага языка. Яшчэ адзін прыклад з адносінаў масы і ейнае рэакцыі з апошніх дзён. Думаю тутака аб Грамадзе. Магутны ўздойм, шуканьне свае формы ўскалыхнула народам і паклікала армію ў рады сялянска-работніцкае арганізацыі.

Ці гэта быў сапраўды волат на гліняных нагах, ці ў Грамадзе мо' было яшчэ за шмат чужога?.. Адказаць на гэта было-б сяньня захутка, сяньня маем лішне мала фактычнага матар'ялу ў руках, каб рабіць станоўкія прысуды.

Характар адзінкі з'яўляецца выпладам спадчыны па продках з судзеяньнем асяродзішча. Тое самае трэба сказаць аб характары народу. Асяродзішчам будзе ён сам і яго суседзі. Адначасна падзеі гэнага ж чалавека ці цэлага народу паказацівамуць на ягоны характар.

Дык што можна казаць аб нашым нацыянальным характары? Апрача вышэй названых і падчыркнутых нахілаў да спакойна-кантэмпляцыйнага жыцьця і любасьці да свайго старадаўняга, трэба сказаць, што не паказаў ён аканчальнае свае формы, у якой ён быўбы зусім сабою. Паасобныя ўздоймы рэвалюцыйныя — гэта толькі паказальнік, што ёсьць туга, шуканьне свайго шляху. Калі дагэтуль народ беларускі не праявіў у шырэйшым маштабе свайго твару, дык безумоўна дзякуючы сваім аснаўным рысам, а передусім вонкавым умовам жыцьця, у якіх ён дасюль знаходзіўся.

Ці гэныя аснаўныя рысы часам ня маюць у сабе прысуду на будучыню, інакш кажучы, ці ня будуць яны тым дзейнікам, дзякуючы якому народ не астоіцца перад азброеным сьветам, асабліва гэным блізкім сьветам суседзяў? Дасюлешняя практыка казала-б нам хутчэй аб тым, што гэная вонкавая нядужасьць мае ў сабе таёмную сілу апоры. Жыцьцё цячэ; новыя надыходзячыя хвормы дадуць калісь і Беларусу паказаць сябе, заняць сваё месца паміж іншымі народамі.

Цяжкі шлях Беларуса быў дагэтуль, ня лёгкі ён будзе ў бліжэйшай будучыні. Мы лішне далёкія і іншыя ад сумежных з намі народаў, каб маглі лёгка знайсьці сябе самых. Зарука нашае будучыні ў дзеяньні ў сваёй собскай форме, адказываючай нашаму характару.

*1935 г.*

# З зацемак аб тэатры

Роля тэатру вельмі важная ў жыцьці чалавека і народаў. Ёсьць некаторыя, што кажуць, быццам само жыцьцё гэта бясконцы, значыцца ад пачатку існаваньня чалавека да ягонага канца, тэатр.

Ці правільна гэта ці не — спрачацца ня будзем, адцемлюючы толькі, што бязумоўна значэньне і роля тэатру вельмі важная і гэта вые-

вілася ў надта далёкай ужо мінуўшчыне, калі ледзь-ледзь чалавек пачаў арганізаваць першую грамаду, калі сышлося некалькі чалавек, каб супольна бараніцца перад зьвяром ці перад благім чалавекам. Дык усюды, дзе ёсьць грамадзкае жыцьцё, усюды ёсьць і тэатр.

Назаўсёды завем тэатральнае запраўдным імем — значыцца тэатрам. Возьмем народныя абрады, возьмем хрэсьбіны, возьмем хаўтуры, успамянем задушкі, дзядоў, ці возьмем вясельныя, жніўныя ці іншыя абрады — усюды ў іх мы знойдзем магутныя доказы тэатральнага інстынкту паміж Беларусамі. Гэта ведама, свомасьць шмат шырэйшая і не абмяжоўваецца выключна Беларусамі і тэрыторыяю Беларусі. Аб тэатры чуем у надта далёкай мінуўшчыне, да сяньня яшчэ глядзельнікі захопліваюцца трагедыямі старых Грэкаў, столькі ў іх зьместу багатага, агульна чалавецкага.

Тэатр — патрэба натуральная і вельмі важная ў жыцьці грамадаў людзей. Тэатр ня толькі мілая гульня, гэта магутны нахіл адзінкі ўявіць праўду, абычаі, спасьцярогі пры помачы канкрэтных абразоў. Бяз помачы гэных пачуцьцёў, якія выклікае тэатр, няпрывыкшаму да абстрактнага думаньня некаторыя паймы астаюцца чужымі, ён ня можа ўявіць сабе іх зусім.

Дзеля гэтага наглядаем ува ўсіх культах рэлігійных гэткі развой тэатральнасьці. Духоўнікі, людзі пакліканыя, каб некаторыя праўды паказываюць, распаўсюджываць, былі прымушаныя дэманстраваць Найвышэйшую Істоту абразна, каб думаючы аб Ёй было лягчэй уявіць, каб гэная Істота была нечым, каб гэта ня быў толькі адзін парожні гук.

Адначасна тэатральнасьць мае іншыя жаролы ў чалавеку. Кожны чалавек мае свае думкі, настроі, кожны імкнецца па меры магчымасьці падзяліцца з імі са сваім асяродзішчам; выказваючы свае, яшчэ мо' ня зусім уяўленыя думкі, чалавек пачынае лепш бачыць іх у сабе. Толькі вось ня ўсенька можна выказаць словам. Іншым разам аж нешта сьціскае пад сэрцам, а ня ведаеш, што яно там сапраўды, нечага чалавек хоча, за нечым тужыць, аб нечым лятуціць. Гэта ведае кожны, адзін больш, другі менш, аднак гэта свомасьць надта характэрная ў людзей. Маладыя маюць „настроі" больш ярка падчыркнуты, у іншых да познага веку астаюцца яны вельмі моцнымі і жывымі.

Гэныя вось настроі ўяўляюцца найлепш у вершах, музыцы, скоках, адным словам у абразным прадстаўленьні. Ясна, хворма гэта-

га прадстаўленьня будзе розная, залежна ад роўня культуры, ад багацьця хвормаў, якімі карыстаецца і якімі валодае дадзенае згуртаваньне людзей. Аснаўны аднак характар астаецца ўсюды той самы, і настолькі нам накідаецца, што нават часта зусім нам далёкае і адлежнасьцю геаграфічнаю і ўмовамі жыцьця самога гаворыць да нас абразамі кожнаму блізкімі і зразумелымі.

Заўсёды, думаючы на гэту тэму, накідаецца мне на памяць абразок з жыцьця маляйскае вёскі. Некалькі гадоў таму назад адзін з нямецкіх цыркаў вандроўных (цырк між іншым сусьветнае славы „Надепвеска”) вазіў з сабою горбу гэных, як мы кажам „дзікуноў”, напалову апранутых, заўсёды зьмерзшых, ня гледзячы на гарачую летнюю пару. Гэныя людзі паміж розных сваіх штукаў паказвалі перад глядзельняю свае абычаі вясковыя ў хворме быццам карагодаў, песьняў супольных грамадзкіх. І калі-б заплюшчыць вочы, каб ня бачыць чужых твараў, ці каб прынамся апрануць гэных людзей у выабражэньні ў нашыя шэрыя сьвіткі, дык была-б абсалютная ілюзія беларускае вёскі, з яе сумнымі матывамі хаўтурнымі ці на’т жніўнымі.

Дык тэатр гэта зьявішча незалежнае ад эканамічных мамэнтаў, незалежнае ад змаганьняў сацыяльных, незалежнае ад злыбядаў грамадзкіх і прыватных, гэта ў пэўным сэнсе зьявішча ўнівэрсальнае, прысутнае на кожным пункце кулі зямное. Кажу незалежнае зьявічша, маючы на ўвеце аснаўныя рысы тэатру, бо ў працягу вякоў тэатр апранае розныя хвормы, ён багацейшы ці бяднейшы, ён пакідае па сабе большыя ці меншыя сьледамкі ў сэнсе ўзгадаваньня, бо-ж тэатр узгадоўвае, што зразумець вельмі лёгка, гэта ўсенька залежна ад таго, якія агульныя канюнктуры, якія магчымасьці грашовыя, якімі праблемамі жыве чалавецкая грамада і г. д.

Ёсьць пэрыяды заняпаду тэатру, хаця не прападае ён ніколі; ён патрэба душы, як хлеб патрэба цела. Побач з хлебам будуць рознаякія стравы, ад пары да пары тая ці іншая страва мо’ вельмі смашная будзе на нашым стале, аднак да хлеба заўсёды мы вернемся.

Пэрыядам заняпаду тэатру, праяваў тэатральных, быццам на’т інстынкту тэатральнасьці, былі нядаўнія ў нас гады, калі чужое ў нас духавенства, асабліва каталіцкае, у сваём змаганьні (што за парадокс) з „брэднюшкамі”, як гэта казалі, пачалі выганяць з хатаў старыя абычаі, песьні, абрады.

Некаторыя сяньняшнія воласьці нашае заходняе тэрыторыі няшчасныя, зусім „глухія” куткі, дзе сумна і мляўка пляцецца дзень ра-

бочы, дзе народ пачынае быццам стогнучы дзень і канчае яго без ніякае радасьці. Яны ня маюць хвормы прыгожае дзеля сваіх перажываньняў, а ня маючы хвормы вонкавае, ня маюць тае глыбіні, шчырасьці і тае простае радаснасьці гэтак карыснае дзеля агульнага ўздойму, бадзёрых адносінаў да жыцьцёвага току.

Тэатр, песьня, музыка – усенька стульна злучана з сабою і адно з аднаго выходзіць, дапаўняе адно адное і дае тое каліва шчасьця і радасьці, да якое гэтак пражна імкнецца жывая адзінка.

Гэтак разумеючы вялікае значэньне тэатру і іншых праяваў мастацкасьці ў жыцьці адзінкі й грамады, лёгка ўявім сабе, якія могуць быць нашыя адносіны да іх.

*1935 г.*

# Узгадаваньне характару

Шмат балючак у нашым нацыянальным жыцьці. Дзе ня глянуць, скуль ня кінуць вокам – усюды блага, усюды дрэнна. Паказваць на'т ня трэба, усе мы бачым добра. Казаць аб іх аднолька-ж трэба, кратацца – на месцы не стаяць, калі хочам перамены, калі хочам, каб сьветазарнае заўтра зіхацела прад намі бліжэй, каб здужалі мы ня толькі аб ім лятуцець, працаваць, змагацца, а й убачыць собскімі вачыма.

Благоцьце нацыянальнае беларускае падзяліць можна з боку гледжаньня прычыны: 1-е надворнае – вонкавае і 2-е ўсярэдзіннае – унутранае. Аднаго і другога самыя мы, Беларусы, будзем прычынамі безпасярэднымі або пасярэднымі. Прычыны няшчасьця надворныя – прыкладам тыя ці іншыя абставіны палітычныя, сацыяльныя з асноведзьдзю агульна-эўропэйскаю ці агульна-сусьветнаю – ведама мала залежныя ад нас. Ці-ж вінавацімець хто нас сёньня, што заняпад наш трываў доўга, ці, што пачалося адраджэньне пазьней на нашай тэрыторыі, чымся ў іншых дружынах славянскіх?! Калі-б была гэткая гутарка, дык ведама мэтнасьці ў ёй ня надта шмат мы нашлі-б. Нашчадкі адказываюць за правілы дзядоў-прадзедаў па столькі па колькі будуць яны аб'ектам, дзе праяўляецца выплад дзеяў мінуўшчыны. Актыўнае – маральнае адказнасці на іх няма ніякае.

Ці мы вінаватчыкі безпасярэднія разьдзелу Беларусі на некалькі частак? Усім, хто ня ведае абставінаў жыцьця Усходняе Эўропы, і хто

разьмяркоўвае ўсенька на свой лад, а знача Французы, Германцы, Італьянцы глядзяць па „заходняму” — дык магчыма прыдасцца, што калі мы ня маема чаго, што паводле нас нам належыцца, дык мы і адказваем за бяздольле свае. Гляньце на сваіх суседзяў — яны мелі правы, яны як сьлед скарысталі з бязладзьдзя, якое тамака чаўплося, ці інакш кажучы, трэба было адносна іх паказаць справядлівасьць чалавецкую, яны дасьпелі (быццам і тутака неабходная нейкая дасьпеласьць адумысловая, а ня толькі права жывое істоты), каб прыняць яе на сябе. А дзеля гэтага, калі вы й кажаце аб крыўдзе нейкай, дык ужо вашая віна.

Вось, што мы пачулі-б ад чужых людзей.

Гэта адносна надворных прычынаў. Так ці інакш баронімся ад закідаў магчымых сваіх і чужых.

Інакш будзе, калі глянем на прычыны ўсярэдзінныя, якія з нас пачынаюцца, карэньні якіх растуць у асобах, сэрцах, мазгах, словам у думках нас самых. Кажу нас самых, знача ўжо дзеля гэтага трэ' спадзевацца адказнасьці. Думаю, што будзем згодныя на тое, што чалавек, пакуль ён здароў, на розуме і на целе адказвае за дзеі свае.

А шмат у чым трэба-б пакаяцца, сказаць — вінаватыя гледзячы на цяжкое жыцьцё сваё й народу... Людзі спадзеюцца на будучыну, ждучы ад яе перамены. Ці заўсёды і ўсюды абаснаваныя гэныя спадзеўкі?! Безумоўна, не.

У аднэй з часопісаў быў зроблены агляд меркаваньняў магчымых адносна пытаньня „Чым палепшыць сучаснае палажэньне?”. Адзін адказ — перамена абставінаў палітычных у вялікім масштабе, перамена прынцыповая істнуючага ладу, а стуль хвалі новага жыцьця падхопяцца да нас і спыніцца ўсенька, ад чаго плачама цяпер. А дзеж самыя Беларусы? бо неяк у такой праграме іх ня відаць?! — Згодна з паглядам вышэй паказаным — пункт апоры ня ў нас, а недзе ў іншым месцы. Адносіны нашы паводле іх хай будуць найбольш спагадныя ўсім, хто ласкава схоча глянуць на нас.

Гэтак адныя.

Іншыя наадварот. Кажуць — трэ' спадзявацца толькі на сябе, на сваю дужасьць, бо чужыя прыяцялі могуць зьвясьці. Вось дзеля чаго трэба ладзіць ува ўсіх галінах жыцьцё, каб ніколі не аглядацца на вонкавыя спагады ці перапынкі. Хочучы быць кансэквэнтным у гэным імкненьні, трэба шукаць шляхаў да зьдзейсьненьня іх.

Дык вось чаму, калі падумаем толькі аб сучасным палажэньні, неабходна выяўляецца прад намі пытаньне характару. Ведама-ж сапраўдным чалавекам будзе чалавек з дужым характарам, бо, як убачым ніжэй, само ўжо гэнае паняцьце абхоплівае мэту жыцьця — змаганьня, кругатропы да падыходжаньня да яе. Скажа хто, што гутараць нам аб характары ў пару дасьпяваньня, цяпер калі мы ўжо дазрэўшыя людзі, дык няма калі спыняцца над гэтым, кожная хвіліна дарагая...

Адказваць нат' на закід такі ня сьлед. Хто ня бачыць, што вялікая частка моладзі нашае мадзее, туліняецца маральна, ня бачачы нідзе прыпынку, апоры! Пачаткова яшчэ сяк-гэтак, пакуль дух малады кіпіць, кідаецца на ўсе бакі, хапаючыся за рознаякастныя ідэі, якія трапляюцца прад ею, а потым астынуўшы, замучыўшыся адкараскваецца ад усяго, зачыняецца ў вузенькіх рамках эгоістычных імкненьняў. Дзеля нястачы характару й тутка няма суцэльнасьці, і гэны эгоізм не вялікі, бо не хапае дужасьці каб зьдзейсьніць і яго.

Калі магчыма нешта такое ў тое ці іншае моладзі — немагчыма ў Беларусоў. Мы ім, а яны нам не раўня.

Глянь чытачу на тое, што буду казаць, а ўбачыш неабходнасьць вялікую падумаць, разважыць, дасьледзіць да канца пытаньне ўзгадаваньня характару. Мо' скранешся й ты, бо прызнацца кожнаму трэба, што з характарам у нас дрэнна. Чаму й скуль пачынаецца і чаўпецца тое блага? У першай чарзе школа сучасная, дрэнная агульна, што-ж казаць аб той, якую бачым у нас. Штодзённае жыцьцё выяўляе за шмат мо' нат прыкладаў. Адзін з пэдагогаў кажа: „Сяньняшняя школа падтрымліваець пассыўны, інэртны характар, узгадоўвае глядзельнікаў жыцьця, якія найлепей ужо калі здоляюць ведаць, ніколі ня будуць умець хацець". Глянуўшы добра нат і апошніх ня шмат убачым.

Небясьпеку абнядужаньня паўсюднага адносна сілаў унутраных бачаць усенькія лепшыя адзінкі зпаміж людзей, якія ўзгадоўваюць моладзь. Літэратура замежная поўная гэтым праблемам. Цікуюць ня толькі настаўнікі, а і палітыкі, і грамадзкія працаўнікі, і часта больш сьведамыя з бацькаў. Усе з свайго боку гледжаньня зацікаўлены. Зацікаўленасьць гэная не з аднае прагі за навіною. Дый пытаньне само надта ня новае, яно ўжо мае сваю вялікую мінуўшчыну, пачынаючуюся калісь у пару расьцьвету думкі старасьветных Грэкаў, захоплівае амаль ня бязвыключна той грамадны натоўп

найвялікшых адзінак з шаругі думаньнікаў такое меры, як Кант, Лёк, Гербарт...

Навіна ў адношаньні да гледжаньня на характар адна мо' толькі будзе — гэта мэтады, якімі валадаюць і хочуць карыстацца людзі, лятуцячы аб зьдзейсьненьні будучага, ідэальнага чалавека. Скажам, што сёньня праблема нашая мае погляд больш навучны, трываўкі, калісь былі хутчэй прыгожыя пажаданьні, абаснаваныя на досьледах розуму без датарнаваньня ўсяго, чаго вучаць практыкаваньні ці самое жыцьцё.

Дык жывучасьць гэнае праблемы не адгэтуль. Жывучасьць яе ў том паўсюдным маракаваньні, бядаваньні па нястачы людзей з характарам. Вонкавасьць захоплівае ўсіх і імчыць за сабою, не пакідае хвілінкі, каб глянуць у сярэдзіну, „пакалупацца" з самым сабою, прывыкаема лёгкаважыць усенька, што ня блішчыць, не маніць вока надворнаю пазорнасьцю... Гэткае адношаньне пакіне выплады бязумоўна благія, бо-ж уся дагэтачасная нашая культура, калі й можа пышніцца здабыткамі, дык ня з эгоізму яны, наадварот — крыніцаю ім была самаахвярнасьць, самазрачэньне собскага, невялікага на карысць паўсюднасьці, праяваў жыцьця ня мінаючых.

Заблытанасьць адносінаў сёньняшніх у кожнай галіне, скумячанасьць бязумоўна вялікшая, чымся была калісь, вымагае ад кожнае адзінкі заўсёднага напружаньня ўсярэдзіннага, каб ня блудзіць наманіцамі, сустрэнуўшы слабенькую якую запыню на шляху сваім, ды каб не расьцярушыцца самому зусім.

Напружаньне гэнае ня што іншае як „трываўкасьць прэдпасылак маральных у суцэльнасьці духовага ядра чалавека"*.

Паўсюдны напрамак, шлях, якім і сёньня йдзе ці валачэцца чалавецкасьць, забыўся аб нейкім тым мэтафізічным, абстракцыйным характары. Глядзелі ўчора, глядзяць й сёньня да рэальнага, да таго, што карысным маніцца, прынамся на заўтра. Далёка глядзець ня хочуць, яно й ня цікаўна чалавеку, які жыве лёзунгам сёньняшнасьці.

Гэны напрамак пакідаў вялізарныя сьляды ва ўсенькіх галінах, дык няма што дзівіцца, калі ўсюды, на кожнай асноведзі думак найбольш крыштальных — выпаўзлі шчарубінкі, робячыя немагчымым й так даволі крывое лагво дзеяў чалавека. Глянуць на абставіны са-

* Л. Залескі.

цыяльныя, калі змалку дзіця расьце ў бядзе, голадзе, холадзе, гледзячы на роскаш, раскідлівасьць сьветам цяпер валадаючых, ці гэта спагадае ўзгадаваньню поўнага чалавека?! Галіна нацыянальная жыцьця з падзелам на дзяржаўныя і недзяржаўныя народы, на народы большасьці і меншасьці, што выклікае аднолькава ў адных і другіх, дзеля рознаякіх прычынаў, бязупынную барацьбу, змаганьне паміж загадамі паслухмянасьці, а любоўю да свайго народу... Канфлікты духовыя гэткія, ясна, характару цьвёрдага не даюць.

Дык што рабіць? Ці ждаць пакуль усё пераменіцца й тады думаць аб распрацоўцы ў сабе чалавека? Ведама на гэткім становішчы астацца немагчыма, ужо дзеля таго, што чалавек з прыроды свае ймкнецца да шчасьця, а што зноў шчасьце сапраўднае магчыма зьдзейсьніць дужаму, магутнаму, валадару прадусім самога сябе, трэба думаць аб узгадаваньні ў сабе гэнае дужасьці воладарства душы. Праца тутака ня гледзячы на нішто ня спынялася й ня спыніцца. Трэба толькі аднаго, каб шырока распаўсюдзілася паняцьцё, дзе яно, тое сапраўднае шчасьце. Трэба сьцяміць, што ўсенькія істнуючыя балячкі, ці агульна магчымыя, залекаваць магчыма не шляхам дзеяньня вонкавага, а наладжваньня ўсярэдзіннага.

Вывад апошні, праўда вялікая — вядомая здаўна, ведалі яе людзі старасьветныя, аднолькава-ж праўду гэную трэба няспыняючыся паўтараць, каб разьвеяла яна старыя пагляды.

Дык знача трэба страсянуць у сабе душу, каб прачнулася ў ёй імкненьне да свабоды сапраўднае, незалежнасьці ад мінаючага, не закранваючага сутнасьці зьявішчаў, адношаньня. Ня трэба дзеля гэтага хавацца ў сабе, зачыняцца абсалютна ад кіпучага жыцьця, ня трэба ялавістае кантэмпляцыі — а трэба наладзіць парадак у сабе. Праяваю, магчымасьцю гэнага ладу й будзе характар. Вось чаму гэта пытаньне й будзе загадам агульна-чалавецкім дзеля нас і адначасна нацыянальным.

Няма думаю ў нікога сумлівасьцяў, што адносна ўзгадаваньня характару, сёньня блага зусім. Калі-б папытацца што-ж гэта такое характар, у чым ягоная сутнасьць, у чым праяўляецца ягонае ўзгадаваньне — дык пачулі-б мы або нейкія агульныя растлумачваньні, або кожны чалавек адказваў інакш, па свойму. Шмат хто казаў-бы нам аб немагчымасьці пераінакнаваньня характару, бо ён у нас прыродны, што мы дастаём у спадчыне, ці інакш кажучы — якім радзіўся, такім і пражывеш. Дзеля гэтага пакрысе трэба сказаць, аб чым

думаем кажучы характар, ці сапараўды магчымая гутарка аб ягоным узгадаваньні, ці мо' мы абманваем сябе, лятуцім толькі аб прыгожых мрыях?!

Дасюлешнія пагляды на характар можна падзяліць на дзве групы: 1-я — пагляды фізыолёгічныя і 2-я — псыхолёгічныя.

У першых паняцьце характару супольна лучыцца з тэмпэрамэнтам, а тэмпэрамэнт гэта сьвядомасьць, абапёртая на праявах фізыолёгічна-анатамічных жыцьця чалавека. Адзін з дасьледчыкаў кажа прыкладам аб абсалютнай залежнасьці характару (тэмпэрамэнту) ад шырыні, вялічыні жылаў крывяных* ; іншы абасноўвае ўсенька на якасьці тонуса нэрваў** . У шмат вялікага ліку аўтараў гэнага пагляду, ня гледзячы на даволі вялікія разыходжаньні, магчыма ўбачыць чародныя чатыры разгаліненьні характару*** : 1) мэлянхолічны, 2) сангвінічны, 3) флегматычны, 4) халерычны.

— Памылка іхняя ў тым, што маняцца знайсьці прычынныя адношаньні, дзе іх няма зусім. Магчыма было-б казаць аб прысутнасьці гэтае лучнасьці, аднолька-ж трэба астацца ў плашчыні гыпотэзаў, яны-ж выказваюць прэтэнсыі да навучнасьці, беззакідлівасьці сваіх паглядаў. А як раз навучнасьці тутака й ня бачым.

Бязумоўна згадзіцца нам трэба, што натуральны падклад прыродных нахілаў уплывае на характар. Толькі-ж ня ўплыў, у плывавасьць магчымая ў розных людзей неаднолькавая, дый у аднаго й таго самага яна або расьце, або гібее ці зусім прападае.

Дык вось чаму бліжэй праўды пагляды псыхолёгічныя. Шмат напрамкаў бачым тутака, залежна ад мэтадаў падыходжаньня да праблемы. Гэткім чынам адзін з напрамкаў псыхолёгічнае школы карыстаецца інтуіцыяю выключна ў сваіх досьледах. Іншыя бяруць за фундамант некалькі рысаў, падхопленных імі з натуры і з іх робяць свае вывады. Трэція ставяць будыніну свайго гледжаньня, дасьледуючы асьцярожна кожны паасобны факт і з вялізарнае колькасьці ўбачаных фактаў імкнуцца да вываду паўсюднага, агульнага. Апошняя галіна досьледаў, якую завуць псыхографіяю навучнаю, хаця й мае будучыну, дагэтуль мала яшчэ распрацавана.

Кожны з памянёных мэтадаў мае добрыя стораны. Галасы прадстаўнікаў сучаснае навукі падзеляны паміж імі, дзеля таго трэба бы-

* Лешафт.

** Гэнле.

*** Трэба памятаць, што характар а тэмпэрамэнт тожсамасьць у іх.

ло-б выкарыстаць па меры магчымасьці, што ў іх усіх ёсьць найлепшага. Ня трэ палохацца гэнае вялікае колькасьці поглядаў, мэтадаў. Багацьце іх магло-б казаці нам толькі аб тым, што дагэтуль яшчэ навука ня здоляла схапіць самае сутнасьці характару, хаця вельмі блізка да таго, ніколі-ж разрозьненнасьць гэная ня сьведчыць аб немагчымасьці ўявіць тае сутнасьці. Ждаць пакуль гэнае паняцьце будзе без такіх ужо сумляваньняў нельга, дык таму сьмела, ня гледзячы на недахопы з боку навукі, трэба намаляваць прад сабою воблік чалавека заўтра, чалавека будучага. Інакш думка анямела-б, прасьмягла-б, а мы не крануліся-б з месца, дзе стаім. Трэба прабаваць, навука потым прыдзе на падмогу. Ведаем, што сёньня з узгадаваньнем характару блага, а хочучы, каб было лепш, дык безумоўна неабходна трэ бачыць той ідэал, тую мерку, да якое хочама дарасьці, паводле якое хочама расьці.

Папярэднія разважаньні закратывалі больш тэарэтычную старану характару. Калі-ж гутарка аб практычнай, аб якой думаем прадусім, дык памятаваць трэба, што дэфініцыя характару мусіць абхопліваць чародныя тры пункты: 1) дэфініцыя ня можа разыходзіцца з аснаўною праўдаю душы чалавечае, 2) трэба, каб яна, як сьлед, ацаніла магчымасьць узаемаадносінаў адзінкі і грамадзянства, уплывы паабапальныя, 3) у канцы трэба, каб былі паказаны мэтады зьдзяйсьненьня мэты. Характар абстрактны, не абхопліваючы сапраўднасьці, ніякае цаны для нас ня меў-бы. Дык памятуючы на вышэй памянёныя засьцярогі, дэфініцыя праф. Зажэцкага здаецца, лепш іншых будзе адказвала нам:

„Характар гэта ўмецтва дзеяньня, злучанае з адначаснаю прысутнасьцю магутнае волі, бязупынна растучае і самасведамасьці, датарнаваньне ўсіх магчымых чалавеку багацьцяў сіл жыцьцёвых, скіраванае ў супольнасьці з сваім народам, на належным сабе становішчы, да мэтаў агульна чалавецкіх”.

Пакуль разгледзім дэфініцыю гэтую, гледзячы на іншыя істнуючыя, трэба насамперш адказаць, ці магчымае запраўды ўзгадаваньне характару, калі-б дэфініцыя нат’ была й зусім добраю! Дзе мяжа ўплываў чалавека ўзгадавальніка, ўзгадоўваючага сябе ці іншых людзей?! Адказ надта паважны, бо калі тае магчымасьці няма, дык усенькая гутарка безкарысная, бязмэтная. Праблема будзе вельмі цікаўная, практычнага датарнаваньня ў ёй ня было-б абсалютна ніякога.

Людзі бядульлівыя, што часта наракаюць на бяздольнасьць, безхарактарнасьць сучаснае пары — найчасьцей пярэчаць сабе, кажучы пэсымістычна, што-ж рабіць, калі на тое Воля Божая, фатум, натура ці яшчэ нешта такое. А ўсенька гэта дзякуючы нястачы лёгікі ў мышленьні, дзякуючы недахопу спаціканьня* й самаспаціканьня, няўмецтву ўявіць сабе магутную сувязь прычынную між зьявішчамі, бо-ж усе мы верыма, што ўплываем магутна на цёк той ці іншы вонкавы, а яны сумліваліся-б аб уплывовасьці на цёк усярэдзінны!!

Гэткія пагляды папулярныя, без навучнага фундаманту, вельмі частыя, за імі сьледуюць ня толькі адзінкі ці грамадзянствы, а нат старонкі цэлыя, народы! Ёсьць аднолькавыя погляды й з штэмпэлям навукі.

Агульна ўсенькія навучныя погляды падзелім паводле E. Parissot i E. Martin на тры групы: 1) скептыцыстыя, 2) догматыстыя, 3) рэлятывістыя.

Першыя пярэчаць абы якой магчымасьці. Прынцыповых рысаў душы чалавецкае, як і прынцыповых свомасьцяў целаскладу фізычнага ніхто не пераменіць. Гляньце, кажуць скептыкі на права спадчыньніцтва ў біолёгіі, яно ясна паказуе, што бацькі, дзяды, далёкія продкі робяць нас такімі, а ня іншымі людзьмі.

Перасаджваньне аднолька-ж біолёгічнага права ў зусім іншую галіну ня вельмі стойка. Самая-ж біолёгія дазваляе на зьменчывасьць, ведама ў абмяжованых граніцах. Ці магчымасьць уплыву, разважаючы аналёгічна, была-б тутака за межамі ўплываў?!

Дагматысты аскранно глядзяць. Паводле Лёка, з ягоным чалавекам, што родзіцца як tabula rasa, кожная адзінка аднолькавыя мае нахілы да ўсяго. Дзеля гэтага з дзесяці чалавек, выбраных зусім не адумыслова, а як папала, бязумоўна дзевяць будуць такімі, якімі мы іх узгадаем. Дзеля гэтага у Гэльвэціуса, духовага спадачніка Лёка, гэній — твор абставінаў ад калыбкі да дасьпеласьці. Канец XVIII і ўсенькае XIX стагодзьдзе ня інакш глядзяць.

Ім трэ' закінуць, што падыходзяць яны да жыцьця з апрыорыстычнаю формулаю, з якое потым выходзіць усё, што трэба. Адныя бяруць біолёгічныя правы, другія будуць выходзіць з прэдпасылак мэтафізыкі (прыкладам Кант, Шопэнгаўэр з ягоным „welle

* Обсэрвацыі.

non discitur”). Апрыорыстычнасьць пачаткавая заблытае заўсёды пад канец. Жыцьцё ня толькі розум, мяркаваньне, гэта ня будуць зноў паасобыя, голыя факты з сабою нічым ня злучаныя. У канцы-ж пераменлівасьць, трываўкасьць, гэта-ж паняцьці коррэляцыйныя, якія супражнічаюць заўсёды з сабою. І яшчэ адно – трэ’ памятаваць, што тутака пытаньні: як, дзе, калі вырашаюцца апрычна, а ня гуртом.

Вось чаму бязумоўна лепш адказваюць на праблему рэлятывісты. Няма ў іх абсалютнае трываўкасьці, ці неабмяжованай пераменлівасьці характару. Узгадаваньне ніколі не зачыняецца ў рамах аднаго пакаленьня, таму ня будзем дзівіцца, калі падчас мэта, якую распрацоўваем, здаецца немагчымаю да зьдзейсьненьня адзінцы. Калі хочам бачыць той вялізарны ўплыў самаўзгадаваньня, дык глядзема на чалавецкасьць нат і народ ня ў плашчыне падольнай а стоцьнай, тады цемі дзель нас ня будзе.

Цяпер яшчэ некалькі слоў да паказанае дэфініцыі. Бачым у ёй рысы практычныя, абхопліваючыя ня столькі старану праблемы, сколькі жыцьцёвую.

У багатым паняцьці характару, судзячы з нашых досьледаў, ёсьць дзьве стораны: 1) сума рысаў псыхолёгічных, спадчынных, што чалавек дастаў ад бацькоў, 2) тое ўсенька, што сам чалавек раздабыў. Узаемаадносіны аднае часьці да другое вельмі не аднолькавыя ў розную пару. Гэрбарт аналёгічна бачыць дзьве часьці — кажучы аб іх — аб’ектыўная і суб’ектыўная. Тутака суб’ектыўнаю часьцю былі-б прынцыпы нашага дзеяньня. Лепш яшчэ было-б казаць на гэныя часьці — статычная й дынамічная.

Гэныя стораны асабліва неаднолькавыя будуць ў маладзіка й старога. У першага буйна растуць абедзьве, век дасьпеласьці ў роўнавазе, ў пару схіляньня да зямлі дужэйшая шмат старана статычная.

Сьвет, асяродак, у якім жывем, няспыняючыся новыя ўражаньні аддаюць у маладзіка першынства актыўнасьці, дынамізму, дзякуючы зноў чаму багацеюць статычныя элемэнты (пакуль ня будзе роўнавагі ў пару дасьпеласьці). Тое ймкненьне магутнае сілы маладое, якое хоча ўсенька спазнаць, прысутнасць „навытару дзейнага” й будзе першым сапраўды важным элемэнтам характару. З навытару, амаль ня выключна, ў нас пачынаюцца ўцямкі*, пагляды, пераканьні, а на іх і пабудаваны характар. Вось чаму думаю-

* Паняцьця.

чы аб характары трэ' памятаваць аб дзейным навытары. Пагляды ня чужыя, а собскія, якіх я не падхапіў з чужых гутарак, ці кніжкі дый паклаў у зацемкі мозгу, а пагляды перадуманыя, мае ня толькі з назову, пакажуць чалавека дужага, які ведае чаго і як хацець, які ўмее хацець.

Дзейны навытар забясьпечвае прысутнасьць вясельля душы, тае радасьці, жыцьцёахвотнасьці без чаго й немагчыма зусім сапраўднае жыцьцё.

Гэткае адношаньне, дзейны навытар, неабходна спараджае другі элемэнт характару, мяноўна — сьведамасьць, самасьведамасьць.

Яно й сапраўды — чым далей ад пары дзіцячае, тым лепш выяўляецца розніца паміж аб'ектам і суб'ектам, спасьцярогі адна за другою маўляў крычаць аб гэтым. Спасьцярогі выклікаюць, пакідаюць па сабе новы сьвет, сьвет мрыяў, уяўленьняў. Навытар дзейны, рэакцыя на спасьцярогу, паказуе іншасьць выпладаў фантазыі ад істнуючае рэальнасьці.

Грамадзкае сужыцьцё яшчэ лепш паказуе тую іншасьць аб'екту і суб'екту, спасьцярогі і ўяўленьня. Тое што бачу я, а ня бачаць іныя, пры аднолькавасьці абставінаў — будзе творам суб'ектыўным. Інакш гэта мы ня сьцямім, калі не ў грамадзкім сужыцьці. Хаця й няма паўсюднае згоды, што-ж гэта такое „Я" нашае, кожны крок наш аднолька-ж выяўляе, што я ня тое самае, што мой знаёмы таварыш.

Толькі сьведамы свае якасьці, цэннасцьці чалавек згледзіць, дзе ягонае становішча ў грамадзянстве, ён ня будзе пытацца ды ня будзе ў ём і нясьмеласьці.

Чародны элемэнт характару — гэта актуальны разьвітак духовы. Назоў шырокі, абхопліваў-бы раўнамернае ўзбагачваньне ўсенькіх уладаў душы г. ё. уладаў розуму, волі, почаву (пачуцьця).

Дагэтуль істнуючыя пэрыяды мелі характэрнае пяршынства не аднае дык другое з уладаў, кажуць аб пары рацыяналізму, або зноў пачуцьцё на першай чарзе. Сьцяміць лёгка, што розум і пачуцьцё трэба, каб ішлі заўсёды поруч з сабою. Дурны ніколькі-ж ня будзе чалавекам з характарам. Дзель таго ўжо, што ў апошняга мусіць быць цьвярозасьць прысудаў, паглядаў, а гэта магчыма, калі няма незалежнага думаньня. Што знача незалежнасьць у думаньні, паказуе сёньняшняя школа. У ёй расьцярушаны унівэрсалізм з адначаснаю аднабокасьцю пакідаюць выплады, перамагчы якіх гадунцы ніяк ня здужаюць часта дакуль жывуць.

Дужасьць, могутнасьць волі настолькі свомна характару, што сустракаем часта ідэнтыфікацыю абодвых паняцьцяў. Дужасьць гэная вельмі нятрываўкая, калыткая, за ею трэба заўсёды сачыць, каб пружыністасць яе не паменшала, до невялічкае дзеі, якая перамітусіць непарушныя, здаецца, здабычы. Без яе розум нічога не здужае. Будзе бачыў нат' і мэту прад сабою, мэту вялікую, ўсёабхопліваючую, а не кранецца да яе, не ўмеціме хацець яе зьдзейсьніць. Рэалізуючы волю, трэба ймкнуцца йсьці да яе шляхам адначасна адзінкавым – індывідуальным і грамадзкім – сацыяльным. Недахоп аднаго з учасьнікаў – непраходная запыня. Прыкладам, калі няма згоды паміж школаю і бацькоўскаю хатаю, калі аднаго вучаць аб рэлігіі, а бачымо, што тыя самыя настаўнікі робяць інакш, ўсенька гэта волі не ўзгадоўвае, ня робіць яе дужэйшаю.

Волі трэба імпульсаў. Імпульсы гэныя не заўсёды адныя і тыя самыя. Трэба патрапляць падхапляць згукі, дзе поруч з вечным будзе тое з сучаснасьці, што найбольш закранае адзінку.

Дзеля таго, што воля пачынаецца з пачуцьця, трэба каб і гэная ніва ня была ялавінаю, каб на ёй шкодны пырай ня рос, а каб і тутака цьвятнік прыгожы красаваўся. Дабрадзеяньне як трэ' ўзгадаванага пачуцьця бачым асабліва ў рэакцыі на зьявішчы, калі розум не пасьпевае выступіць актыўна, калі нешта робіцца незалежна, апрычна ад яго. Вось тутака пачуцьцё й зможа паказаць сябе. Дык ясна, як глядзець на яго нам прыдзецца.

Згодна з бачаньнем у характары дзьвюх старон – статычнае й дынамічнае, ўсенькія тры памянёныя рысы маглі-б быць абхоплены статычнаю стараною. Усе яны будуць хутчэй магчымасьцю дзеяньня такога, ці іншага, аднолька-ж дзеяньня ня выклікаюць, нат' будучы ў ім потым. Другая частка характару – гэта мэта. Мэта, зорка пуцяводная – вось ад чаго амаль ня бязвыключна залежыць, які́м будзе жыцьцё. Хай будзе ўсенька іншае й вельмі багатае – й воля трываўкая й розум вялікі і г. д., а калі мэта благая, дык карысьці адтуль няма ніякае ні грамадзянству, ні самай адзінцы.

Бязумоўна найшляхотнейшая мэта, без магчымасьці зьдзейсьненьня яе, гэта знача без прысутнасьці наладжанае першае палавіны характару, сьлядоў не пакіне па сабе, блісьне, што тая маланка, глянуць на яе людцы, пагаманяць крышку і больш рупіцца ня будуць.

Мэта дзеліць людзей, на партыі, markdownрознаякія напрамкі пры аднолькавасьці іншых рысаў характару. Дык бачымо адгэтуль, што яна

й ахварбоўвае ў розныя коляры грамадзкае, нацыянальнае, агульна-сусьветнае жыцьцё. Кажучы аб мэце, ідэі інакш, памятуйма, што не даволі, каб гэта абы якая была мэта, хай і надта ідэальная, не эгоістычная, нат' абхопліваючая кругазорам сьвет усенькі. Не — гэтага мала. Трэба яшчэ, каб яна была рэальна, каб была магчымасьць яе зьдзейсьніць. Гэткая ідэя — мэта згуртуе, аб'яднае й паасобных людзей й вялікія іх грамады — народы. Мэта рэальная, вялікая, падымаючая чалавека што раз вышэй, адчыняючая яму вочы на шчасьце, якая вучыць яго, што шчасьце сапраўднае адзінкі стульна злучана са шчасьцем арганічнае суцэльнасьці — народу, не апрычных клясаў яго, мэта такая так-жа й будучае шчасьце, паўсюднае чалавецтва, шлях да якога бязумоўна праз народ.

— Вось чаму дэфініцыя праф. Закжэўскага найбольш нам адказвае. Яна, як ня трэ лепш абхапіла абедзвія часьці — дынамічную і статычную характару. Бо гляньма на такую дэфініцыю: „характар гэта выплад суцэльнасьці прывычкаў маральных, разумна разгрупаваных каля аднае восі — волі" (P. Gillet, L'Education du caractere, Paris).

Як бачымо дэфініцыя статычная. Гляньма на іншую: „характар гэта зьлічво простае шматлікіх пахілаў, якія змагаюцца паміж сабою аб жыцьцё чалавека" (P. Dubois, „L'education de soi-meme"). Дэфініцыя выключна дынамічная.

*1928 г.*

# *Аб прывычцы ў самаўзгадаваньні*

Характар у чалавека-адзінкі, чалавека-народу, чалавека-дзяржавы — гэта ўсенька. Тутака й шчасьце, бяздольле, мадзеньне бясконцае й дзейнасьць кіпуча-карысная. Прысутнасьць ягоная, ці адсутнасьць — асноведзьдзю ўсіх магчымасьцяў. Цяпер асабліва, калі ўсюды ў нас плоймы злыдняў-зданьняў лунаюць, агортваючы сьветлыя ідэалы йлжою, трэба змагацца, трэба клікнуць усю магутнасьць характару, бараніцца ня перад сумляваньнямі аб праўдзе нашага шляху, а перад тым, каб ня згубіць яго, каб не расьцярушыцца ў штодзеншчыне, каб ані на хвіліну не апынуцца з пытаньнем: „ці так?", „дзе ён — наш шлях?", а магчыма па чарзе й „нашто, пашто", а потым і сапраўды, каб не застрагнуць у жыцьцёвай дрыгве-трасіне. Боязна, каб яна — дрыгва — нас не засмактала!! Гляньма на маразм у су-

часных валадароў сьвету, ці нашых суседзяў! — Каб нам ня бачыць на сабе гэткае заразы!!

Найвялікшы ідэал нічога, — калі і пакуль мала робяць дзеля зьдзяйсьненьня яго. Ён будзе сам у сабе без перамены, не паменшае, не пагоршае, ды й мы ад яго будзем адступаць, а не падыходзіць, калі абмяжуемся лятуценьнямі, прыгожымі гутаркамі, ці бядульлівымі сказамі аб сучаснасьці.

Нам трэба дужых, цьвёрдых людзей, а не расхістаных ды страгнучых у плыткасьцях.

Хай падумаюць, у каго сэрца яшчэ не астыла, яшчэ адклікаецца на згукі шырокія, думкі вялікія, што да сьвятое-вялікае справы трэба ўзгадаваць, дагадаваць сябе. І тыя знойдуць мо' ў ніжэй паказаных словах шмат спасьцярог, якія не замяніла-б, каб ведалі ўсенькія.

* * *

Кажам аб добрых і благіх звыках, больш цямячы на кірунак благога. Кажама аб звыку п'янства, кляцьбы, — а менш думаем аб звыку памяркоўнасьці, цярплівасьці... Аднолькава-ж розьніцы сапраўднае, глыбокае паміж цнотамі, а пахібамі, благімі старонамі характару ня ўбачыцца. Жывема мы з бязумоўнаю прысутнасьцю волі ў сабе, волі — дык знача незалежнага, самахотнага выбару гэткага, ці іншага дзеяньня, — ды не заўсёды „вольная воля" паказуе сябе. Вялікая частка ўсенькіх людзей жыве хутчэй імпульсамі, залежна ад прывычкі казаць гэтак, ці рабіць, залежна ад нахілу прыроднага, ці ўзгадаванага. Прывычкі, звычкі, нахілы — вось дзякуючы чаму немагчыма нам быць іншымі, калі-б мы й хацелі бачыць у сабе іншую, лепшую рэакцыю на ўсе магчымыя праявы жыцьця.

У прывычцы, зьявішчы звыкаў — адначасна шчасьце з няшчасьцем. Дзякуючы ім перад намі бясконцы шлях не парываў, а напружаньня, без чаго трывалае будучыні няма. Парывамі жывуць хвіліны; жыцьцё, стагодзьдзе хаця й мераюць хвілінамі, ды гэта ня тое самае. Быць волатам-героям на хвіліну, кажуць, лягчэй, чымся шэрым змагаром чуняць адзін год. Гэтыя прывычкі праклёнам будуць, калі з благое крыніцы яны ў нас!

Зьявішча прывычкі абаснавана мо' на тым, што сьвядомыя нашыя падзеі, ды ўсе агулам магчымыя, пачынаюцца ў нэрвовай сыстэме. Свомасьць аднолькава й нэрвовага каліўя і цэлае сыстэмы — гэта адказ на раздражненьне. Адказ гэты або будзе рэфлексам, або сьвядомаю праяваю рознаякае дзейнасьці. Свомасьць, у якой

практыкаваньні зробяць нешта, перадом хто казаў-бы немагчымае. А гэта дзякуючы плястыцы мозгавае тканіны. У ёй быццам пратоптваецца дарожка, цярэбіцца пуцявіна, па якой новая адказная дзейнасьць выявіцца хутчэй, лягчэй, а паждаўшы тая самая дзейнасьць, на якую трэба было напружаньня вялікага, а цяпер у нас — маўляў просты хрыбетны рэфлекс, рэфлексная дуга.

Дзеля таго й кажуць, што звык — гэта нашая другая натура, а льга было-б казаць — што яшчэ больш. Прывычкі могуць здужаць, паняволіць і натуру, прыродныя нахілы. Дзевяцьдзесят дзевяць і дзевяць дзесятых усяго, што мы робім, гэта з прывычкі, ня думаючы зусім. Мы ведаем, што робім устаючы, апранаючыся, потым кратаючыся ўвесь дзень, і кладучыся адпачываць, аднолькава-ж гэта ўсё аўтаматычныя рухі. Рэфлекс з канцавін нэрваў на калені, ці пятцы, а гэткія дзеі суседуюць з сабою калі ня ў тэорыі, дык у сапраўднасьці.

Нешта магчымае было-б у тых людзей, якім трэба надумляцца, ці сядзець цяпер ці стаяць, курыць ці не, кладавіцца, ці яшчэ не і г.д., гэта-ж мука нявыказная, такія сумляваньні прадусім забіваюць, адбіраюць характар, выкідаюць такога чалавека з ліку працаздольных адзінак, ён быў-бы ў нас хворым, псыхопатам.

Мы ўсенькія — ня думаючы — гэткія практыкаваньні наладжваем змалку ўжо. Маці з бацькаю першыя нам настаўнікі, хатнія абставіны ўкладаюць нас да рэакцыяў такіх ці іншых, потым равесьнікі, іхні капітал моральны й толькі ў пару сьвядомае думкі собскае, у пару дасьпяваньня ўсебаковага, мы сьвядома самі пачынаем укладаньні. Стульна ўвесь час злучаны з сабою ўкладаньні фізычныя — ад вельмі простых, як хадзьба, да вельмі заблытаных умецтваў штукарства. Бяспынная аналёгія хай нас тутака навучыла-б аб тых неабмежаваных магчымасьцях звыкаў.

Добрыя бацькі, добрыя настаўнікі часта дадуць такую аснову маладзіку з хатняга й школьнага ўзгадаваньня, што лёгка яму потым стаяць на сваём шляху і ня трэба рабіць адумысловых ахвяраў, каб прышчапіць сабе карысную ці неабходную мо' прывычку. Ня шмат будзе гэткіх шчасьлівых!..

Прафэсар Бэн паказвае некалькі правілаў вельмі карысных таму, хто хоча нешта з звыкаў кінуць, а збагацець новымі прывычкамі.

Першае — хочучы зьдзейсьніць або адно або другое, ці абодвыя жаданьні адначасна, трэба пастановы рабіць з усею дужасьцю і непарушнасьцю энэргіі ў нас магчымае. Уяўляйма сабе ў гэткія хвілі-

ны ўсе абставіны, якія па магчымасьці будуць спагаднымі нашым пастановам. Прыдбайма іх такімі, калі нам будзе лягчэй вытрываць у новых прывычках, ці забыцца аб старых. Напружвайма ўсю сілу, каб ня мінуць і першае нагоды, дзе трэба паказаць перад сабою й людзьмі новыя рысы характару. Перад людзьмі дзеля таго, што лягчэй трываць з пастановаю нейкаю, памятуючы, што людзі сочаць за мною й зробяць прысуд, калі будуць ведаць, што я йнакш кажу, а йнакш раблю, — бачучы мае спробы адхіліцца ад зробленых пастановаў.

Другое правіла — ніколі не рабіць выключнасьцяў, пакуль новая прывычка намі не заваладае, пакуль яна для нас ня будзе неабходнасьцю. Тое самае што з клубком ніцей: навіваем, навіваем, а як упаў, дык ня хутка наўем назад тое, што было ўжо, ня кажучы аб пабольшаньні. Бязспыннасьць навытару й у сыстэме нэрваў, як ведаем, мае значэньне вялічэзнае. Тое й тутака. Раўнуючы прывычкі моральныя рознаякастнага напрамку з ворагамі-змагальнікамі, праф. Бэн кажа: „найвялікшым нашым імкненьнем у дасягненьні ідэалу ў гэнай галіне — гэта такі тасунак вышэйпаказаных ворагаў, каб у аднаго былі адна за аднэю перамогі, пакуль навытар у іх абуджае нас настолькі, што нягледзячы на ніякія запыні, заўсёды зробіма што належыць ад нас". Сапраўды, гэта адзін магчымы шлях поступу духовага.

Калі ня шукацімем нагоды, каб узмацаваць свае здабычы, — карысьці з пастановаў ня будзе. Чалавек мерацімецца й самым пад канец дзён сваіх і нашчадкамі, што будуць па ім, не шляхотнымі прынцыпамі, якія меў, ня тымі лятуценьнямі, ад якіх манілася яму, ён пакідае зямлю й лунаючы над ею, забыўшыся на ўсенька, робіць максімум. Самая лепшая пастанова, шляхотная думка, калі бяз выпладу астанецца, не пакіне рэальнага рэзультату — горш яшчэ чымся-б іх зусім ня было. Пры другой аказіі думка аб здрадніцтве колішнім ня дасьць магчымасьці выявіцца ўсенькай патрэбнай дужасьці. Бязсумліўна, няма больш благога чалавека, чымся бязвольны, сэнтымэнтальны лятуценьнік, які шмат і прыгожа, вельмі прыгожа гавора, а сапраўды дык ніколі нічога як сьлед па мужчынску не зрабіў.

Вельмі цікаўна паслухацца на тое, што кажа Дарвін, дзе як ня трэ' лепш паказвае сілу навытару — прывычкі: „Да трыццатага году, ці пазьней яшчэ, я вельмі любіў паэзію; быўшы яшчэ вучням, я ўжо захопліваўся Шэкспірам, асабліва-ж ягонымі драмамі гіста-

рычнымі. Любіў я калісь і малярства, а музыка была мне насалодаю раскошнаю.

Цяпер ніякім чынам ня здолею прымусіць сябе, каб прачытаць абыякі верш. Узяў я прачытаць Шэкспіра, гэткі прыдаўся мне мляўкі, што й ахвота прапала. Няма й колішняга захопленьня перад малюнкамі, музыкаю... Здаецца мозаг мой цяпер быццам нейкая машына для формуляцыі законаў агульных з дзеяў паасобных; уцяміць не магу, дзеля чаго аднолькава-ж недзе счэзьлі тыя часьці мозгу, якімі я ўяўляў прыгожасьць...

Калі-б было магчыма нанава жыць-пражыць, — правілам, неабходнасьцю мне было-б прачытаць крышку вершаў, паўслухацца на мілазычныя гукі музыкі, прынамся раз на тыдзень; мо' тады тыя часьціны мозагу, якія чэзнуць цяпер, былі-б здаровыя, рэагавалі-б на ўсенька. Ня маючы тых спадобаў, ня маю я й таго шчасьця, якое ёсьць у кожным прыгожстве; дзякуючы гэнай нястачы розум мой мо' ня будзе гэткім пруткім у будучыне, шкада й майго характару, бо дзеля гэтага не расьце ў ём старана пачуцьцёвая".

Шмат хто з маладых з гарачаю, прагавітаю душою на ўсенька, чым жыве, дыхае думка чалавецкая, бачыў сябе й у будучыне далёкай заўсёды маладым, бо-ж моладасьць не гадамі трэ' мерыць, а пругкасьцю, жывадзейнасьцю душы. А ён уяўляў душу сваю вечна кіпучаю, з смагаю таго, што добрае, прыгожае...

Усе інтэлігенты, якім часта трэба абмяжавацца ў сваёй адумысловасьці, кажуць — пакуль яшчэ небасхіл іх вялікі, — што ўсенькія галіны чалавецкае думкі чужымі ім ня будуць.

Ці шмат аднолькава-ж паміж намі тых сапраўды вечна маладых, ці прынамся людзей, якія не астаюцца з-заду ад поступу, якія сочаць за меркаваньнямі й здабычамі дужэйшых за іх, што самыя цярэбяць шлях да заўтра?

Ня шмат, вельмі іх мала. А чаму так, бачыма добра з правілаў прывычкі. Якая што ніна ёсьць вялікая зацікаўленасьць, калі не карміць усё новаю страваю — змадзее, прападзе ад напору штодзенных, шэрых прывычкаў. Мы шчыра цяпер хочам, каб усё, што толькі хапае за душу цяпер, назаўсёды з намі было, ды нічога дзеля гэтага ня робім, ня кратаемся, каб зацікаўленасьць была нашаю прывычкаю а ня плыткія нахілы. Трэба пачынаць навытар ад сёньня, а ў нас калі й думаем аб укладаньні, дык і то пакідаем назаўтра. А дабра, перамогі няма без напружаньня, змаганьня мо' ня лёгкага пачаткова.

Тыя, што мелі магчымасьць паглядзець на сыноў усходу — Індусаў — і параўнаць іх твар з эўропэйскімі, не маглі надзівіцца нейкай шляхотнасьці, якую ў іх бачылі, паважнасьці, розуму, вялікай інтэлігэнцыі у людзей без асьветы. А яно ня так ужо, каб заблытаны быў адказ. Тутака. Жывуць яны больш па чалавецку, чымся мы, прывыклі штодзень, хай некалькі хвілін, падумаць аб найбольш патайных пытаннях, імкненьнях сваіх. Гэта-ж у іх бацькаўшчыне мэтоды перамогі над сабою, ці, лепш казаць, над плыткімі сваімі нахіламі, зьдзейсьнілі верх дасканальнасьці. А ўсяму прычына — штодзенны, бязспынны навытар у напрамку зробленых пастановаў.

І таму ня трэба аглядацца за чым вялікім, каб паказаць сабе, што я не драмлю, а чуняю, іду наперад, а карыстаць з таго, што кожны дзень нам дае. Нагодаў штодзень, напагляд вельмі малых (бо ў сапраўднасьці яны-ж усенька), шмат. Гэта, як кажуць, будзе нейкая адносна самых сябе „штрахоўка". Пакуль што будзем плаціць і плаціць сваімі змаганьнямі, аж прыдзе й тая часіна, калі карысьць уявіцца прад намі. Будзе такая пара, калі маланкі й пяруны жыцьця справядлівага ды бязміласэрнага будуць грукацець нада мною, а я непарушны буду, усе-ж людзі хістацца, дрыжэць, што лісьця ад ветру на дрэвах. Шлях шырокі, вялікі прад намі, памятайма й ня дляймася!

*1928 г.*

# „Учора" і „сяньня"

Спрэчкі філёзафаў і лёгікаў, ці ёсьць абсалютная праўда (не толькі ў плошчы рэлігійнае праблемы) былі і будуць заўсёды жывымі. Ці пагодзяцца рэлятывістыя з прыхільнікамі пагляду, што ўчарашняя праўда на заўсёды астанецца праўдаю такою самаю для ўсіх, якою была ўчора, — няма ведама.

Калі-б праўда існавала, пасколькі яе ўяўляла-б адзінка, дык была-б яна надта хісткаю. Адзінкаю ўладаюць сэнтымэнты розныя, настроі. Ад настрояў і сэнтымэнтаў ды ад рознаякіх практычных мяркаваньняў залежала-б тады і праўда!..

Даволі красамоўна бачым адлюстраваньне рэлятывізму праўды ў аднэй з апошніх кніжак ведамае польскае пісьменьніцы Налкоў-

скае. Назоў кніжкі „Благая любоў”*. Чаму гутарка аб гэнай кніжыцы якга на бачынах беларускага часапісу? Дзеля таго — у першую чаргу, — што пісьменьніца некалькі разоў закранае беларушчыну, беларускага мужыка. Не разглядае плянова нічога асобна беларускага, а спыняецца над гэным пытаньнем пастолькі, пакалькі ёй трэба паказаць на перамены ў польскім грамадзянстве даваенным і сучасным. Беларушчына выступае, як асноведзь, на якой лягчэй, больш пуката можна пабачыць гэныя перамены.

Зьмест „Благое любові” ня важны дзеля нас. У аповесьці ёсьць некалькі аснаўных ніцяў раману, ніцяў мясцамі вельмі заблытаных, паміж тымі самымі і рознымі людзьмі. Акцыя праводзіцца ў адным з „крэсавых” мястэчак, якое пасьля вайны вырасла на сталіцу ваяводзтва. На арэне выступаюць урадоўцы (як прыватныя адзінкі), абшарнікі, грамадзкія дзеячы, даволі вялікі сьцяг дамаў і панячак, найчасьцей прадстаўнічак пасьляваеннага ўжо пакаленьня. Гэная рыса — проблематыка душы жанчын, аналіза нутранога іхняга жыцьця — вельмі характэрная дзеля творства Налкоўскае агулам.

Бацька аднае з дамаў, доля загнала якую ў ролі жонкі ўрадоўца ў гэнае глухое мястэчка, чалавек з вялікага сьвету. Гэта адзін з дзеячоў перадваенных, чалавек блізкі да тых, што давялі да незалежнасьці Польскае дзяржавы. Гэны Валевіч глядзіць быццам аб’ектыўна на тое, што робіцца ў канкрэтных умовах жыцьцёвых, і наскольki мoжа падсумоўвае перамену ад учора да сяньня нікаторых лёзунгаў і сам дзівіцца, што сапраўды робіцца з людзьмі і ідэямі. Ці людзі мяняюцца, ці ідэі — гэта пусты гук, ці мо’ толькі ўчарашняя праўда ў сяньняшнім аспэкце мае іншы воблік?..

Глядзіць ён на людзей кіруючых гэным куском зямлі і рознаякія рэфлексыі лезуць плоймамі яму ў галаву. — „Вось прыкладам Валевіч думаў калісь, як аб нечым надта простым і бязсумліўным, што кожны народ павінен мець сваю зямлю і свае граніцы, хаця-б народ быў найменшым. У сапраўднасьці гэта ня было ані простае ані бязсумліўнае. Вось сьвет здрыгануўся, задрыжаў на сваіх фундамэнтах і гэныя словы, гэная простая праўда азначала ўжо цяпер зусім нешта іншае.

Калісь гэныя словы — свая зямля і свае граніцы — гэта была Польшча, гэта была ейная незалежнасьць і магутнасьць. Сяньня гэта азначала-б абнядужаньне Польшчы і меншыя ейныя граніцы”.

---

* „Niedobra miłość”. Nałkowska. — Romans prowincjonalny.

Як працяг гэтых думак, бачым сказы такія:...„калісь, у тыя часы, Валевіч глыбака браў да сэрца лёс людзей, якія за сваю дзейнасьць ідэйную лучалі ў вязьніцы... Ён быў з тых, якія цьвёрда дзяржаліcь пагляду, што ніхто ня можа адбіраць свабоды за пагляды і за гэныя пагляды вешаць на шыбеніцах. Думаў ён, што сапраўды на душы ляжала яму думка аб агідзе ламаньня духа чалавечага ў ягоных шляхотных імкненьнях. Думаў, што сапраўды рупіўся ён заўсёды да супроцьстаўленьня сабе ідэі і гвалту. А вось вышла цяпер пры новай коньюнктуры, пасьля вялікага зруху ў фактах рэчаіснасьці, што гэныя словы, гэныя собскія, дарагія лёзунгі, яму прыдаюцца цяпер бяз сэнсу ды проста агідлівымі".

„Былі яны сапраўды дэмагогічным сказам, як казалі калісь ягоныя праціўнікі, адкуль пачалі ўцелаішчаць нешта іншае, адкуль пачалі яны прадстаўляць нешта варожае і небясьпечнае.

Каб усё гэта ўявіць, трэба было пэражыць перамогу свае ідэі".

Быццам перадумаўшы ўсё гэта, Валевіч цераз аўтарку снуе гэткія думкі: „зьдзейсьненьне кажнае гістарычнае ідэі азначае такія ейныя суадносіны з сапраўднасьцю, каб новая ідэя была найбольш сходная з тым, на месца чаго яна прышла. І толькі тады яна можа валадаць і трываць, калі закараніцца ў тых самых мясцох зямлі, з каторых вырвала яна ранейшыя, калі ўвальлецца ў выемкі колішняга жыцьця і да гэных выемак датарнуецца найстульней.

Дык вось цяпер іншыя, новыя людзі сядзелі ў вязьніцах, бо вязьніцы... ня могуць быць парожнімі. І яны, гэныя ўжо людзі, казалі, што нельга зачыняць людзей за ідэі. І зноў пасуседзку зусім, за межамі краіны, дзе іх крыўдзілі, у рэвалюцыйных вязьніцах былі зачынены тыя, каторыя маглі па гэтай старане граніцы зачыняць у вязьніцах.

Ня толькі словы, ня толькі ідэя і лятуценьне ў вечнай абнове сьвета было нечым іншым. Нечым іншым робіцца і самое зьдзяйсьненьне. Ды нат' зямля і граніцы кажны раз азначалі нешта іншае".

І трудна сказаць, з сумам ці з іроніяю пісьменьніка пытаецца: „Мо' Валевіч зусім не перамяніўся, мо ня трэ' сароміцца яму за сваю маладосьць. Мо' гэта толькі бязупынна мяняўся сьвет, і дзеля гэтага ягонае месца за кажным разам было іншае" (бач. 69-71).

Аўтарка вельмі крытычна і востра судзіць і ацэнівае шмат якіх пасьляваенных прадстаўнікоў „крэсовага грамадзянства". „Учарашняе" гэных людзей не дае часта, на пагляд аўтаркі, ім дазволу глу-

міць людзей і думкі і пагляды. Паказывае яна тыпы і вайсковых і дзеячоў самаўрадавых і ўрадоўцаў. Сымпатыя ейная па старане дэмакратыі. Усякім адхілам ад дэмакратыі, ад справядлівасьці не шкадуе яна вострае сатыры. Не шкадуе яна вострых слоў для прадстаўнікоў учарашняга дня, якія ня імкнуліся да зьдзейсьненьня сяньняшняга дня, якім учора надта любае. Да такіх вось тыпаў належыць старая графіня Осенецкая.

Гэтая асоба намагаецца, датарнаваўшысь па меры магчымасьці да сучаснасьці, вярнуцца да мінуўшых дзён. „Пані Осенецкая добра ўпраўляла сваімі маёнткамі. У ейных маленькіх ручках людзі ўвіхались з натугаю і сьпехам, працавалі да сёмага поту. Тое самае было і з жывёлаю, ды нат плугі, машыны, трактары і тыя працавалі быццам да апошніх мераў магчымасьці.

Дзерла яна з зямлі не для сябе праўда. Ды за тое і не для сваіх людзей. Стогнучая служба ледзь-ледзь магла дастаць належныя ёй ардынарыі. Служба наракала на немагчымае памешканьне, гэная служба прымушана была таргавацца за грошы, якія зарабіла”.

Гэная п. Осенецкая ведала аб парадках у сваіх маёнтках. Уважала, што йнакш не трэба, ці мо’ інакш нат’ і немагчыма. Сама калісь расказывала: „Я ніколі не хаджу да іхніх (службы) хатаў. Ведаю, што ў іх жудасна, я абсалютна не магу на гэта глядзець. Дзеці там сядзяць у холадзе і макраце, сьцены там дзіравыя, цераз стрэхі цячэ”...

Пані Осенецкая бачыць, што мужыкі маюць вочы, што яны ўмеюць ацаніць належныя да іх адносіны. Аўтарка гаворыць: „усе найміты неахвотна хадзілі на панскае поле. Ведалі, што чалавечыя сілы будуць там выкарыстаны да апошняга, да таго-ж гэныя людзі думалі аб землях, якія абраблялі, як аб нечым, што належаціме да іх” (бач. 87).

Пані Осенецкая быццам мела калісь іншыя пагляды на гэных мужыкоў-„хамаў”. Быццам яна ўмела хадзіць да іхніх цёмных сьцюдзёных хатаў, насіла ім лекі, памагала ўсяляк. Сяньня яна ведае, „што гэта злосныя, дурныя барбары, гэта тая маса, з каторае вышаў забойца ейнага малодшага сына”.

Осенецкія ніяк не маглі пасьпець за пераменаю ў парадку і ладзе пасьляваенным, не дапускалі думкі, што „урад, сам урад адчыняе мужыкам школы ў роднай мове, што гэны ўрад з публічных грошаў, народных грошаў утрымлівае настаўнікаў у гэных школах,

настаўнікаў тутэйшых, аўтахтонаў”... (бач. 88). І ў сапраўднай роспачы і аканчальным зьняверанньні пытаецца Осенецкая: „ці можна ўявіць, ці можна падумаць, каб нешта такое рабіла Англія... У нас не разумеюць, што толькі моцная рука, толькі вострая ўлада можа ўсё гэта неяк трымаць у парадку”.

На пагляд п. Осенецкае, добры пан не карыстаецца ніякім аўтарытэтам. Калі, скажам, такі пан пазычае сялянам прылады гаспадарчыя, калі дае ім лепшае зярно, калі не бярэ грошаў за занятую жывёлу, дык мужыкі тады думаюць, што гэткі пан баіцца іх, што ён быццам сядзіць не на сваём, „а мужыка трэба біць, застаўшы яго ў шкодзе, трэба трымаць пагрозамі, тады толькі ён будзе паслухмяны і пакорны, тады не вырасьце з яго разбойнік”.

Уся натуга графіні ідзе на тое, каб найбольш высмактаць з зямлі. На сапраўдны зьдзек выглядае, што ўсе тыя прадукты, якія мужыкі цяжкаю працаю выпрадукавалі з зямлі, ішлі на стол жыдоўскіх кансумэнтаў, якія адны толькі маглі купляць розныя ласушкі. А грошы ішлі заграніцу да сына, які меў падтрымаць высокія амбіцыі панскага роду.

Ня ўсе людзі са сфэры бліскае да графіні думаюць аднолькавымі з ею катэгорыямі. Прыкладам, іншым чалавекам будзе жонка ваяводы. Ваяводзіха заглядаецца на сытуацыю графіні, што тая магла-б інакш жыць. Паводле ваяводзіхі можна на вёсцы знайсьці падыход да сялян, можна паказаць народу добрае сэрца і цераз гэнае сэрца выклікаць давер...

Такіх людзей новых, як ваяводзіха, яшчэ вельмі мала. Земляўласьнікі сабраўшыся ў графіні ўмеюць толькі наракаць на ўрад, на малую апеку над імі, на пагражаючую ім парцэляцыю, на мужыкоў, радыкальна настроеных. Наракаюць, што настроі сялянства ня сустракаюць больш рашучага адпору са стараны ўладаў.

Усё гэта высказвалі ў такі спосаб, быццам гэта былі праблемы агульныя, грамадзкія, у якіх усе зацікаўленыя. Сапраўды аднак выходзіла на тое, што наракалі яны на свае клопаты, што хацелі выкарыстаць сытуацыю, каб абгаварыць іх у прыватным памешканьні з урадавымі дзейнікамі замест зьвяртацца да апошніх да афіцыяльнага бюро.

Гэныя людзі ня ўмелі датарнавацца да новых умоваў жыцьцёвых, баранілі сваіх колішніх прывілеяў і ў змаганьні за штодзенныя дробязі гублялі свой аснаўны тып, мянялі свой характар (101).

Жыцьцё штораз больш крутое сьціскала іх быццам абцугамі. Культура іхняя, традыцыі, мінуўшчына на сяньня ня былі здавальняючым аргумэнтам. Былі яны яшчэ арыстократыяю. Косьці іхнія былі крыху танчэйшыя, апранываліс яны часта лепш. За тое мянялась тое, што было найбольш сутным, іншая была ў іх ужо мэнтальнасьць, структура псыхічная. Клопаты, дробныя раструскі, неабходнасьць змаганьня за кусок хлеба – усё гэта было або нечым, да чаго яны прывыклі, або ад чаго адвыклі ў цэлым сьцягу пакаленьняў. Новы лад выклікаў у іх новы сьветапагляд, мяняў адносіны да жыцьця. Згубілі яны панскую пэўнасьць і адначасна тую нейкую бязінтэрэсоўнасьць, якую можна наглядаць і ў сытага сабакі ў адносінах да галоднага цюцькі-бадзякі.

Сяньня ў іншых сфэрах вялісь гутаркі аб каханьні, аб мастацтве, аб прыгожых жанчынах, кніжках і падарожах, аб усіх прадметах, мо' зусім непатрэбных, якія зьяўляюцца крыніцаю псыхічнае роскашы.

Вывад і аканчальны прысуд аўтаркі, – што ў сфэры „крэсавых" земляўласьнікаў спробы эканамічных клопатаў ня выдзержала культура інтэлектуальная.

Іншы тып паказаны аўтаркаю – сыновая Осенецкае, амэрыканка з паходжаньня. Лучыла „да нас" з таго асяродзішча, дзе ў пасьляваенную пару „былі модныя гуманітарныя адносіны да права кажнага народу, да собскага жыцьця паводле нерэальнае ідэолёгіі Вільсона". Блізка да сэрца Флёр „чужыя меншасьці нацыянальныя, прыгнечаныя ў чужых дзяржавах"... Гэная чужаземка выказывала свае пагляды шчыра, ня гледзячы, ці каму мо' гэта зусім не ўспадобу. Цікавілась усім, езьдзіла з мужам па маёнтках і ваколіцах. Езьдзіла ня дзеля спорту, а каб усё паглядзець. Навучылась хутка пазнаваць селяніна беларуса ад паляка. Шмат чаго ёй не падабалась у краёвай рэчаістасьці.

Флёр са сваім цьвёрдым падыходам да жыцьця не магла зразумець шмат якіх зьявішчаў, якія наглядала. У аднэй з гутарак са старою Осенецкаю апошняя казала ёй аб знатнасьці роду, аб вялікіх ягоных заслугах у мінуўшчыне, ужо хаця-б дзеля таго толькі, што „пільнаваў" свайго гнязда.

Пытаецца Флёр: „а што гэта такое датрываць на становішчы?" Ці гэта азначае, што яны радзілісь і паміралі на гэным месцы па тое, каб якга „датрываць"? І адказвае, што аканчальна найлягчэй, калі чалавек якга жыве і працуе там, дзе радзіўся. Гэта і робіць каж-

ны тутэйшы селянін і ніхто не захопліваецца тым, што селянін „датрываў", што не пакінуў свае мовы беларускае".

Старая графіня паклікаецца тады на пралітую кроў продкаў, на заслугі іхнія і змаганьні ў паўстаньнях. Гэта мала зразумела паамэрыканску ўзгадаванай маладой графіні. На ейны пагляд зусім ня трэба выступаць проці свае ўлады. „Аб тым (паўстаньні) гаворыцца тутака – геройства. Тыя-ж сяляне, што забілі Валерага (другі сын Осенецкае) так сама імкнуліся да нейкае незалежнасьці і яны змагаліся за зямлю. Толькі што ў іх гэта называецца азьвярэласьць. Ці-ж вы ўсё-такі ня бачыце, што гэныя зьявішчы сходныя з сабою?".

Ці аўтарка добра ведае ўмовы і лад сялянскага жыцьця тых ваколіцаў, якія выводзіць у сваёй аповесьці, сказаць трудна. Хутчэй аднак што не, ня ведае. Калі ведае, дык з птушынага лёту. Яна хоча быць аднолькава об'ектыўнаю і да маладое і да старое Осенецкае і да Валевіча і да ўсіх іншых тыпаў. Об'ектыўная яна між іншым і да праблемы беларускае. Яна стаіць за аснаўныя правы да жыцьця кажнае адзінкі, кажнага народу, яна за права кажнага станавіць самому аб сваім лёсе.

І мо' дзякуючы таму, што ня ведае яна тутэйшага жыцьця ў дэталях, дзякуючы таму, што яна далёкая, ня тутэйшая, пачуцьцёва не зацікаўлена, – дзякуючы гэтаму змагла прадставіць бяз большых пахібаў адну са старон краёвага жыцьця. Яна ня злоўжывае інтэлекту. Аб гэным злоўжываньні гаворыць яна вельмі красамоўна. „Калі падумаць над дзейнасьцю інтэлекту, дык гэта ён паясьняе, апраўдывае, што зьдзейсьніла даўно пачуцьцё. Інтэлект па тое, каб абаснаваў нашае дзеяньне, каб успакоіў нашыя сумлівы. Дзеля матывіроўкі, можна казаць, служаць усякія лёзунгі" (бач. 208).

Сьведамасьць аб ролі інтэлекту высказаная ў форме даволі рызыкоўнай, амаль што не парадоксальнай, хай нам паможа знайсьці адказ на сумлівы, як паясьніць такія вялікія разыходжаньні паміж людзьмі ды лёзунгамі дзён „учарашніх" і „сяньняшніх".

*1938 г.*

# *Трагічны крызыс*

Аднэй з характэрных, найбольш мо' важных свомасьцяў і праяваў жыцьця зьяўляецца рух. У пайме руху ляжыць імкненьне (у самым прадмеце ці дзеючай волі) да нечага новага. Рух — гэта перамена месца, пошукі новых аспэктаў, новых формаў жыцьця.

Ад пачатку арганізаванага жыцьця ў людзей наглядаецца гэнае самае зьявішча. Новыя ідэі, вандроўкі людзей паасобных і народаў, сацыяльныя, рэлігійныя, эканамічныя плыні, а ў сувязі з гэтым войны, рэвалюцыі, змаганьні аружныя і неаружныя — гэта ня што іншае, як праявы таго самага біолёгічнага закону, датарнаванага да канкрэтнае эпохі. Гэныя рознаякія „рухі" — сьведамыя й нясьведамыя, прадбачаныя й непрадбачаныя, ці накінутыя незалежнымі вонкавымі ўмовамі, — зьдзейсьняюць паасобныя культы й цывілізацыі. Вядомы нам сьвет у сваю гістарычную пару перажыў шмат заняпадаў і нарадзінаў новых культураў і цывілізацыяў.

Ці заняпады адных эпохаў і паяўленьне новых прыходзілі крытычна, значыцца раптоўна, неспадзеўкі, трудна сказаць. Трэба думаць, што крызыс, аднолькава з гэтым, як наглядаем у біолёгіі, мае свае прадпасылкі. Прадпасылкі, вялікае іх мноства, расьцярушываюць нашую ўвагу й дзякуючы таму сам крызыс часта здаецца нам зусім незразумелым, вырасшым неспадзеўкі, хаця ён толькі лёгічным канчаткам ранейшых фактаў.

Мы сяньня прывыклі да самога тэрміну „крызыс". Ён не прадстаўляе для нас быццам нічога таёмнага. Усе прывыклі да крызысу эканамічнага, які толькі што перажылі, ці яшчэ перажываем. Крызыс сяньня — гэта нешта пэрманэнтнае. Наймаладзейшае, пасьляваеннае пакаленьне не ведае агулам іншых умоваў жыцьця, чымся з пары „крызысу". Думаючы аб крызысе, маем на ўвеце адну толькі ягоную старану, мяноўна эканамічную. У сапраўднасьці гэта адна толькі з праяваў трагічных нашых дзён, ломкі старога, пошукаў новага, нейкае вялікае мітусні ідэяў, лёзунгаў з павадырамі ўсякіх масьцяў. За гэнымі фрагмэнтамі, за жывымі дзеючымі асобамі, за падзеямі блізкімі нам асабіста, ня відаць сапраўднага жарала мітусьні, ня бачым, як чэзьне дасюлешняя форма праяваў душы, ня бачым, як памірае, прыйшоўшы ў тупік, сучасная нам культура й цывілізацыя.

Чаму думаючы аб сучаснай пары датарнаваў-бы да яе назоў „трагічны крызыс"? Дзеля таго, што на'т пры сьмерці вока радуецца новым жыцьцём, якое прышло на зьмену старога. У ймгле, расьцярушанасьці сяньняшняе эпохі ня вырастае нічога новага, што магло-б, хаця-б ад часьці, быць лепшым за паміраючае старое.

Ці сапраўды ніхто ня бачыць і не ўяўляе трагедыі нашых дзён? Ёсьць людзі дальназоркія, цьвярозыя, правільна ацэніваючыя становішча. Іхні голас мала толькі чутны сярод зьвягі падгалоскаў тых, каму патрэбныя чад і гоман ніжэйшых інстынктаў і почаваў чалавека.

З паміж дыягностаў, пішучых у розных мовах, у розных часьцях сьвету, хацеў-бы спыніцца над паглядамі A. Carrela. Кніжка, у якой гаворыць на нашую тэму аўтар, мае назоў „L'homme, cet inconnu" („Чалавек істота няведамая"). Вельмі цікаўна, што аб чалавеку, як аб нечым няведамым, піша біолёг, адзін з найбольш выдатных і заслужаных дасьледчыкаў у сваёй адумысловасьці. Прозьвішча аўтара шырока праслаўленае ў міжнародным сьвеце, як найбольш сьмелага экспэрымэнтатара над тайніцамі жыцьця. У сваёй кніжцы на некалькісот бачынах даў ён чытачу амаль ня поўную сынтэзу ўсяго, што навука ў сваіх рознаякіх галінах даведалася аб чалавеку, як аб суцэльнасьці біолёгічна-псыхічнай. І гэны вучоны называе аканчальна свой твор „Чалавек – істота няведамая"...

Некалькі стагодзьдзяў працяжнае працы ў лабараторыях, кніжніцах, нагляданьня за праявамі натуры паказала нам тайніцы й свомасьці матэрыі, дало ўладаньне над „небам і зямлёю", толькі ўсё гэта не дало адказу, не адчыніла нас самых перад сабою. Гэта тэза й адначасна выснаў Carrela. Кажа ён, што ўвесь поступ цывілізацыі ня вырашыў найважнейшых, найбольш аснаўных праблемаў, чым можам прыдбаць чалавеку больш шчасьця, ад якіх дзейнікаў шчасьце залежыць. І здаецца, што не падыходзілі мы бліжэй да вырашэньня гэтага пытаньня, хаця ўсё было быццам накіравана да гэтага. Заміна ляжала ў памылковым сьветапаглядзе, у самай атмасфэры адносінаў да жыцьця. Матэрыялізм – вось калецтва чалавека. „Вера", што матэрыя крыніца й чалавека й ягонага шчасьця, накіровывала на фальшывы шлях пошукаў у напрамку ня тым, як трэба. Боль, цярпеньні паказывалі, што неяк яно няскладна йдзе, клікалі да рэвізіі паглядаў.

Здабычы тэхнікі выклікалі колёсальныя перамены ў жыцьці штодзенным. Жывецца сяньня лепш і лягчэй, чым калісь. І хаця аўтар

мае на ўвеце Амэрыку з ейнаю цывілізацыяю, можам з ім згадзіцца без засьцярогаў. Бязумоўна, сучасны пралетары й селянін жывуць і ядуць быццам лепш, чымся вяльможа некалькі стагодзьдзяў таму назад.

Здабычы іншых эпохаў, ведамасьці тэхнічныя й агульныя, дзякуючы прэсе, дзякуючы агульнай шырокай асьвеце, узбагачываюць розум. Затое трудна казаць, каб старана маральная паказывала аднолькавы поступ і была на вялікім узроўні. Вера ў матэрыю зрабіла непатрэбную веру ў значэньні рэлігійным.

Як гэта пераломліваецца ў чалавеку? Усе меркаваньні й дзеяньні накіроўваюцца ў напрамку, які здаецца нам практычным і карысным. Тып адзінкі, якая вырастае ў такой атмасфэры, вызначаецца хітрасьцю, адсутнасьцю таго, што завём „хрыбятніцаю маральнаю”. Нястача фундамэнту маральнага, калі няма нічога сьвятога, пэўнага, адклікаецца ў плошчы інтэлекту. Асьвета робіцца патрэбнай, паколькі яна мяркуе аб практычнай старане, няма імкненьня безінтэрэсоўнага паглыбіць яе.

З памылковых адносінаў да праўды жыцьця пачало яно выглядаць, як прыгожы твар адлюстраваны ў крывым люстры. Заняпад маральнасьці, нястача вялікіх ідэалаў, дэгэнарацыя духоўная й далей цялесная — вось дарожка, якая адчыняецца перад намі. А ўсё праз тое, што натуга навукі й тэхнікі мела на ўвеце не найшырэйшае дабро чалавека, а толькі выкарыстаньне ўсіх магчымасьцяў адзінкі й грамады дзеля разьвіцьця і поступу гэнае-ж тэхнікі. Ніхто ня цікавіўся чалавекам-адзінкаю, ня ведалі ці забыліся аб сапраўдным зьмесьце чалавека. Забыліся, што самапазнаньне можа быць лекам на гэнае зраўнаньне ўсіх перад бажком — цывілізацыяю матарыяльнаю.

Чалавек — гэта крыху больш, як пэўная колькасьць фізыка-хімічных свомасьцяў. Дзеля здароўя, значыцца дзеля добрага самапачуваньня, ня толькі важна, каб усе органы цела працавалі без пахібаў. Пачуцьцё, якасьць інтэлекту, узровень маралі, агульнае разьвіцьцё духовае — усё гэта дзейнікі й складовыя часткі здароўя і якасьці адзінкі й ня менш важныя за старану чыста цялесную. Бяз гэных свомасьцяў вышэйшае катэгорыі безкарысны, ці на’т шкодны будзе поступ тэхнічны. Не навукі мэханічныя, фізычныя і хімічныя дадуць нам мараль, здароўе, розум, роўнавагу псыхічную й нэрвовую, пачуцьцё бяспечнасьці. Ня толькі фізыка і фізыёлёгія хай бу-

дуць асновамі ўзгадаваньня, трэба пакінуць належнае месца дзеля характару, праблемаў эстэтыкі, рэлігіі.

Ашчаднасьць, імкненьне да найбольшае карысьці й выкарыстаньня давялі да спэцыялізацыі, звужваючы й абмяжоўваючы агульныя магчымасьці паасобнае адзінкі. Жыцьцё-ж само ня ведае такое вызначанасьці й яно прымушае адзінку непадгатаваную вырашаць у чужой ёй дзялянцы.

Дык ніколі ня можна астацца й бяз людзей, якія выпрацоўваюць сынтэзы, прынамся найважнейшыя з іх.

Дасюлешнія нашыя ведамасьці аб старане цялеснай чалавека вырасьлі вельмі высака. Трэба аднак сказаць, што такія, вельмі простыя, хаця й аснаўныя адначасна пытаньні, як скажам: як зьдзяйсьняецца паняцьце? якія шляхі лучаць мозаг з думкаю? — яны дасюль нем няведамыя й ня вырашаныя. Ахвотна раўняюць арганізм чалавека з машынаю. Калі ёсьць тутака аналёгіі, дык ня трэба забывацца, што й розьніцы вельмі вялікія. Чалавек можа нясумерна больш стрываць, чымся выходзіла-б з магчымасьцяў ягонага цела, дзе нам здаецца мы ўсё разумеем.

Незалежна ад аднароднасьці прыроднае, можна павялічыць інтэлект пры дапамозе працы — прывычкі да мышленьня, спасьцярогаў, нутраное дысцыпліны. Затое пераход хуткі да новых уражаньняў, шматлікія перамены рознаякіх абразоў і перажываньняў, недахоп ці нястача паглыбленьня, няўмеласьць да напружаньня — усё гэта спыняе разьвіцьцё інтэлекту. Можна было-б дадаць, што зашмат спортаў, лішне багатая ежа пакідаюць ад'емныя сьляды на духовым росьце. Аднаго толькі інтэлекту мала на тое, каб стварыць веду. Навуковая праца, досьледы — залежаць ня толькі ад розуму. У вялікай часьці гэта выплад інтуіцыі, выабражэньня — іншых старон і праяваў духа. Нашаю толькі аднабокасьцю можам паясьніць крытычныя адносіны да мэтапсыхікі, тэлепатыі, шостага органу пачуцьця (К. Рышэт). Трэба прыйсьці да вываду, што ёсьць у нас і пачуцьцё маралі. Яно слаба разьвітае, гэта праўда, праца над ім пакінута прадстаўнікoм веравызнаўчых установаў (калі агулам пакінута). Гэнае пачуцьцё можна ўзгадаваць.

Незалежна ад паглядаў, трэба згадзіцца, што адзіным правілам паступаньня, у лепшым разуменьні гэтага слова, у адносінах паміж людзьмі, асталася мараль хрысьціянская. Праўда, на жаль, яна штораз больш цьвёрда адкідаецца, як нейкая непатрэбшчына. Адначасна

бачым, што мараль біолёгічная й прамысловая, як крытэрыі паступаньня, даводзяць да сытуацыяў вельмі добра ведамых усім, між іншым і нам Беларусам. Бяз правілаў нутраных няма роўнавагі ў жыцьці асабістым, грамадзкім, дзяржаўным. Маралі не накіне нам дзяржава. Найбольш накіне яна нам межы, за каторымі чакае нас кара. Апошняя форма ўзгадаваньня ня будзе сапраўдным узгадаваньнем.

У хрысьціянстве наглядаем цікавае зьявішча, сяньня амаль што нам незразумелае. Сьвятыя ў хрысьціянстве не найразумнейшыя, а найбольш стойкія характарам і моцнаю воляю. І сапраўды, пачуцьцё маралі важнейшае ад розуму. Хараство маральнае можа нас хутчэй закрануць і скрануць, чымся хараство прыроды й навукі. Адначасна-ж яно павялічвае сілу інтэлекту. Яно зьяўляецца асноваю лепшае стараны нашае цывілізацыі й культуры ў большай меры, чымся навука й мастацтва.

Умовы сучаснага жыцьця забіваюць эстэтычныя патрэбы й вымогі. Арганізацыя працы нажаль накіроўваецца так, каб прыбіць эстэтычныя пачуцьці. І тутака прападае магчымасьць здабыцьця крышкі шчасьця, неабходнага, каб жыць нармальна, гармонійна. І вось гэнае гармоніі не хапае якга ў нашым сучасным жыцьці. Такі пагляд мае сваё абаснаваньне ў фізыёлёгіі. Аднабокае раздражненьне даводзіць да закалоту ў дзейнасьці на'т чыста цялеснай. А пяршынства матэрыі і ўтылітарызму — гэтыя догматы промыслу — давялі да аднабокасьці ў разьвіцьці адзінкі, выкрывілі культуру інтэлекту. Імкненьне да карысьці, да багацьця робіцца ўсім і ўсё апраўдывае. Такія сытуацыі даводзяць да зьявішча, амаль што натуральнага для нас, што ў вязьніцы сядзяць людзі толькі дурныя. Іншыя, якім, скажам, трэба было-б сядзець, карыстаюцца пашанаю й славаю. Астаючыся пастаянна ў гэтых плынях, чалавек пачынае да іх прывыкаць і ня ўяўляе іншае магчымае рэчаіснасьці.

Бязвыхаднаю ўжо трагедыяю будзе вывад, якога ніхто не аспорывае, што праца — гэта найвялікшае зло. Можна думаць, што ўвесь наш поступ накіроўваецца да таго, каб нічога, а прынамся найменш рабіць. Другая трагедыя, што чалавецтву не пакідаецца „надзеі" іншае, як тая, што менш будзе працы й больш грошаў. Надзея — магутны дзейнік пры вучобе датарнаваньня да новых умоваў. Багацьце ня будзе замінаю ў тых ці іншых імкненьнях адзінкі. Замінаю ў багацьці будзе варожасьць да асяродзішча й консэрватызм, якія йдуць поруч з багацьцем.

Увесь склад нашага жыцьця такі, што не падтрымлівае яно індывідуальнасьці адзінкі, а заганяе яе ў тую ці іншую форму. Да адʼемных старон сучаснае школы, абмінуць якія здаецца зусім немагчыма, – што лішне рана дзіця мусіць уваходзіць у форму. Няма што казаць аб тых пэрспэктывах, якія робяцца вельмі актуальнымі, калі дзеці ад першых дзён будуць узгадовывацца ў грамадзе без атмасфэры хатняе. Калі й будзе тутака натуральны падбор, дык ня ў добрым значэньні паняцьця.

Усё гэта, можна сказаць, адзін вялікі грэх проці натуры. Помста біолёгічная рэалізуецца залежна ад умоваў і магчымасьцяў. Тутака помста праяўляецца ў тым, што ток, разгон жыцьця аслабляе. Прападае ідэя...

* * *

Вось дробная жменя думак з кніжкі Carrela. Carrel — Амэрыканец, чалавек практычны, які лёгічна думае і ўсё даводзіць да канца, ня спынячыся на палавіне дарогі. Паставіўшы дыягнозу на аснове дзі вышэй паказаных фактаў, што чалавецтва апынулася ў тупіку, шукае ён леку. Яму здаецца, што ён яго найшоў. Ці так, – казаць цяжка.

Мы, „адсталыя” людзі, інакш крыху ацэніваем сытуацыю, глядзячы на свой панадворак. Нам не пагражае яшчэ сяньня бязідэйнасьць, вузкі матэрыялізм, мы ўмеем бачыць зоры на небе, а дробныя клопаты – хмаркі хаваюць іх ад нас, аднак ад пуцяводнае зоркі не астаёмся далёка. Дык і лек паводле рэцэпты Carrela прадчасны, хаця ня можна казаць, каб быў ён несымпатычны. „Найвышэйшая рада мудрацоў”, вельмі блізкая да ідэалу манахаў, нікому не пашкодзіць, а памагчы можа шмат каму. Carrel рабіў-бы сваю „раду” паводле агульнага й вострага стажу паасобных сяброў. Мы мо’ вырашылі-б больш індывідуальна, кожна па сабе на свой лад.

Ня будзем спорыць з аўтарам. Важнейшы для нас дыягноз і аналіза сытуацыі, якія праведзены вобразна й пуката. Лішне чорныя колеры мясцамі выкліканы лёкальнымі амэрыканскімі ўмовамі. У цэласьці бяручы, кніжка – гэта крык адчаю чалавека, які глянуў цяжкой праўдзе ў вочы. Выхад з сытуацыі бачыць ня ў поступе цывілізацыі й тэхнікі, а ў старых праўдах, даўно ведамых і таму недацэніваных, як трэба.

Кожны чалавек можа сам толькі навучыцца хадзіць. Усякія хітра выдуманыя прылады, палягчаючыя навуку хадзьбы, – карыс-

ныя пастолькі, што памагаюць менш разоў падаць на зямлю. Знайсьці свой шлях можа кожны паасобку. Стадныя рэцэпты жыцьцё пакідае вельмі хутка, бо яны ня могуць адрабіць работы за адзінку. Усё-ж такі практыка й досьлед чалавека шчырага, сумленнага будзе заўсёды павучальны й што найменш гэтак можам глядзець на кніжку Carrela.

*1939 г.*

# *Паны „Жолондзі"*

У мінулым годзе паявілася ў Вільні у польскай мове повесьць пад назовою „Zwycięstwo Żołądzia". Варта над ею крыху спыніцца. Кніжка гэтая між іншым была нагароджана віленскім Таварыствам Філёматаў і агулам выклікала даволі жывую дыскусію, рэха якой пайшло даволі далёка за Вільню. Цікавая гэта кніжка з беларускага боку гледжаньня. Зьмест коратка повесьці гэтае такі. На тэрыторыі беларускай працуе адна са шматлікіх арганізацыяў, якая завецца Стражаю. Мэта арганізацыі падрыхтаваць кадры будучых змагароў за цэласьць граніцаў польскіх на ўсходзе. Камэндантам Стражы ў адным з паветаў зьяўляецца нейкі Жолондзь, адзін з культуртрэгераў, наехаўшых пашыраць культуру да нас з Галіччыны. У свабодных часінах паміж папойкамі, рамансамі з вучыцелькамі, паненкамі з маёнткаў, займаецца ён замацоўваньнем польскасьці сярод гушчаў сялянскіх. У вадным з аддзелаў арганізацыі паявіўся бальшавіцкі дух. Павадыр гэнае работы бальшавіцкае ўцякае з некалькімі са сваіх спагаднікаў у лес. Стараста, паліцыя, ня маючы даверу сярод насельніцтва і адначасна дзякуючы таму, што паліцыя ўся чужая, якая ня ведае зусім тэрыторыі, дзе хаваюцца гэныя бальшавікі, ня ўмеюць правесьці ліквідацыі гэнае жменькі людзей. Жолондзь выкарыстаў сытуацыю, каб падчыркнуць патрэбу свае арганізацыі, амаль што не правакуе аружны напад гэных бальшавікоў на маёнтак буйнага землеўласьніка і зьяўляецца ў апошні мамэнт, ратуючы старасту і ўсіх гасьцей ад нападу. Дзякуючы гэтаму, забываюцца аб „недалікатных" адносінах Жолондзя да арганізацыйных грошаў. Жолондзь выходзіць героем, у нагароду ён, здаецца, ажэніцца з паненкаю, дачкой землеўласьніка і будзе далей больш радыкальна працаваць над замацаваньнем усходніх граніцаў польскае дзяржавы.

У повесьці, як у крывым люстры, можна бачыць польскую адміністрацыю, грамадзкіх працаўнікоў польскіх арганізацыяў. Гэта ўсё да пэўнае меры рэвэляцыі і можам верыць аўтарцы на слова, што яна лепш за нас ведае ўсе ўзаемаадносіны ў сфэрах землеўласьнікаў, польскага настаўніцтва, урадоўцаў, стараства, паліцыі і г. д. Пакінем зусім на старане тое, што аўтарка піша аб нашым народзе. Народу гэтага яна ня ведае, як ня ведае ягонае мовы, не разумее абычаяў, душы народнае. Цікаўна адзначыць мо' толькі, што ў повесьці праводзіцца думка, што беларус і сяньня такі пацыфіст, так баіцца крыві, што гатоў на'т выдаць сваіх сяброў у рукі паліцыі, каб толькі суседу ягонаму, хаця ён і пан-абшарнік, як кажуць — волас ня спаў з галавы. Дужа сумлеваюся, ці такая адрысоўка характару беларуса правільная.

За тое, як кажу, паверым на слова аўтарцы, што ўсенька тое, што яна кажа аб сваіх людзях — гэта сапраўднасьць. Пачнем ад старасты. Гэта тутэйшы землеўласьнік, якога няведама дзеля чаго трымаюць пакульшто на пасадзе. Чалавек гэны ў аповесьці некалькі разоў трымае тэлефон у руках, курачы пры гэтым шмат папяросаў. Іншым разам ён іграе ў карты, іншым разам з агідаю адварочваецца ад Улькі, жонкі аднаго з сяброў Стражы, які падпаў пад уплывы бальшавіцкія і якога за гэта пасадзілі ў вязьніцу. Жонка, між іншым, у цяжку, праўдамі і няпраўдамі стараецца адведаць мужа і вось нараілі ёй зьвярнуцца да старасты. Стараста, гледзячы з агідаю на яе, пачуўшы, хто яна такая, уцякае. Бачым некалькі разоў гэнага старасту ў гутарках з Волловічам, старшынёю Стражы, на тэму Жолондзя.

Ня выходзячы са Стараства, знаёмімся яшчэ з Огуркевічам, рэфэрэнтам бясьпечнасьці. Гэта чалавек з Галіччыны. Ня ўмее ён аніяк схапіць настрою душы селяніна беларускага. Калі-ж нешта ад яго і пачуем, дык гэта будуць такія словы:...„яны ўсе аднолькавыя (значыцца сяляне)... я-б з іх скуру дзёр... праваслаўнае гэта чужое, паганае..." У іншым месцы зноў ён не шкадуе моцных словаў, каб дамаляваць аўтохтонаў... „дзікарства і дурнота, што валасы на галаве падымаюцца". Зразумела, што лінія ягонае палітыкі даволі простая. Калі нехта пытаецца ў яго, як ён са сваімі паглядамі можа дагаварыцца з народам, дык ён адказвае: „я-ж і не хачу з ім дагаварывацца, а хачу іх толькі акелзаць". Што азначае „акелзаць" у рэфэрэнта бясьпечнасьці, ведаем даволі добра, дык і паясьняць ня трэба.

Паглянем на іншых урадоўцаў, у гэным Старастве. Вельмі часта гэныя людзі „ждуць”. Ждуць, каб хутчэй трэцяя, канец іх працы. Каб ня надта доўжылася, адведываюць карчму жыдка Ротмана, таму, што яна пасуседзку. Огуркевіч дык прынамся ведае меру. Ён афіцыяльна ўпарадку, пап’яному не зьяўляецца ў Старастве. Другі важны рэфэрэнт, дык хістаючыся на нагах, прыходзіць каля трэцяе пачынаць працу. Кумпанія, калі яна часамі і вясёлая, дык казаць ня можна, каб была сымпатычная, ці прынамся салідная.

Прадстаўнікі абшарнікаў, якіх даволі шмат выводзіць аўтарка, розныя па масьці. Ёсьць такі Волловіч, старшыня Стражы, арганізацыі, якая мае ў сфэрах абшарнікаў фірму, напалову бальшавіцкай. Ня ведаем, што загнала Волловіча да старшынства. Чалавек ён даволі асабіста сымпатычны, розумам не далёкі, усё-ж такі ня п’е, грашэй не раскідае на лішнія роскашы. Ня бачым яго нідзе ў рэальнай рабоце, так што яно даволі цяжкавата сказаць, якім ён быў-бы ў адносінах да людзей жывых.

Усе іншыя землеўласьнікі аджыўшыя людзі. Умеюць адно толькі – стагнаць на падаткі, што іх Варшава ня хоча падтрымліваць, што хутка скончыцца іхняя эра, што і зямлю ў іх адбяруць, як яны кажуць „галіцыякі”, а што там крыху астанецца, дык і тое аддадуць сялянам беларускім, каб прысвоіць іх да польшчыны. Хаця яны ўсе яшчэ жывуць, аднак можна сказаць, ня ўмеюць нічога рабіць. Маюць культуру, толькі і тае культуры ня ўмеюць ніяк выкарыстаць, яна ў іх баласт. На’т і маладзейшыя з іх ня ўмеюць быць добрымі працаўнікамі, калі і лучаюць на пасаду, дзякуючы знаёмасьцям са старастаю і г. д.

Жонкі абшарнікаў, агулам жанчыны гэнае сфэры, выходзяць даволі бледна. Некаторыя традыцыйна ўмеюць добра варыць, ці на’т лепш сказаць – пячы. Бяда, што найчасьцей ня маюць з чаго, дык нічога не астаецца ім, як плёткі рабіць. Маладыя з іх, як маладыя, і для таго памоднаму ўзгадованыя, ловяць жыцьцё, кахаюцца.

Побач пана абшарніка, у повесьці польскай бачым, ды ня толькі ў повесьці, але і ў нашай практыцы жыцьцёвай, ксяндза. Ёсьць ён тутака. Ксёндз дзекан зусім традыцыйны. Старэнькі, ахвотнік добра зьесьці і выпіць. Больш аб ём нічога ня можна сказаць.

Ёсьць і настаўнік, ці лепш настаўніца. Бедная дзяўчына, нейкая замораная, ня мае на’т прызваітага абутку на нагах. Вучыць дзяцей чытаць і пісаць, пакідае іх у пару вучобы на... гадзінку, каб ісьці пакахацца з Жолондзем.

Маркотнасьць нейкая абхоплівае чалавека, гледзячы на гэных людзей і міжвольна накідываецца думка, дзе-ж тая пружына, на якой трымаецца ўсё жыцьцё польскае сапраўднасьці сярод беларускага насельніцтва? Бязумоўна, што ёсьць паліцыя, аб ёй часта гаворыцца ў повесьці, выступае яна на сцэну, аднак як орган выканаўчы. Ня відаць за тое ў сфэрах, аб якіх была дагэтуль гутарка, ніякае ідэолёгіі, ніякае думкі, якая магла-б апраўдаць існаваньне такога грамадзянства.

Ёсьць той элемэнт, які паводле аўтаркі рыхтуе будучыну польскую, які зьяўляецца найбольш бадзёрым, да якога бязумоўна належыць гэнае заўтра. Элемэнт бадзёрасьці, элемэнт заўтра ўяўляе Жолондзь, цэнтральная асоба повесьці. Цікава будзе прыглядзецца да гэтага чалавека. Гаворыць ён сам аб сабе шмат. Гавораць аб ім іншыя асобы, гавораць аб ім тое, што ён робіць. Аб мінуўшчыне героя ведаем мала. Малым хлапцом уцёк ён з хаты і пашоў ваяваць. Бадзяўся па розных фронтах. Сын шаўца, да якога неахвотна прызнаецца, кончыў 6 клясаў гімназіі і вось ён адказны грамадзкі працаўнік. На ім трымаецца акцыя Стражы. Калі старшыня Стражы хоча яго выкінуць за кражу грамадзкіх грошаў, дык стараста бароніць, кажучы, што такіх працаўнікоў мала дзе можна сустрэнуць.

Жолондзь, камэндант Стражы, едзе на паседжаньне ўраду аднаго з аддзелаў і думае: „ці надта доўгія і скучныя будуць нарады і ці сапраўды прыедзе Зоня” (Зоня – гэта дачка старшыні Стражы). Да Зоні ён узяўся вельмі шчыра. Яна не падабаецца яму зусім. За тое дачка і спадкаберніца Волловіча. Бацька ейны мае маёнтак, на які мае вялікую ахвоту сам Жолондзь. А вось што сам аб сабе кажа гэны герой: „ах, каб мець іх усіх (жанчын) на кожны кліч! кожную іншую, патрэбную думкам, сэрцу, крыві! Каб мець шмат грошаў, каб раскідаць іх прыгоршчамі, бяз думкі аб заўтрашні дзень! Каб мець грамадзкую чэсьць такую велікую, каб ніхто ня сьмеў приступіцца з крытыкаю. Каб таптаць нагамі масы...”

І гэны вось панок на сходках Стражы навучае аб працы на карысьць дзяржавы, агулам польшчыны. Рэзультаты працы такіх людзей – загадзя можна казаць – будуць надта сумніўныя. Няма на грош веры, шчырасьці, усё, што гаворыць такі чалавек – гэта пустаслоўе. Нядзіўна таму, калі пачуем на паседжаньні ўраду аддзелу Стражы пры абгаворыванньні справы большае актывізацыі працы: – „ніколі ня можна дачакацца, каб яны (сяляне) плацілі за прадстаўленьне, добра што дарма прыходзяць!”... Бачым у Стражы эле-

мэнт, які цікуе на карысьць з арганізацыі пры падатках, цікуе на палёгкі пры адбыўцы службы вайсковае і г. д.

Сумныя рэфлексыі агортываюць чалавека, глянуўшы на такую галерэю тыпаў. Хто-ж тады трымае ў сваіх руках нашага селяніна?

Выглядае з повесьці, што паны Жолондзі зусім бяскарна гаспадараць ня толькі над нашымі грашмі, што ідуць у падатках, ці розных ахвярах, яны-ж адначасова трымаюць, прынамся фармальна, уладу над душамі нашае моладзі, заганяючы яе ў свае арганізацыі, рыхтуючы яе да будучага жыцьця!

Наканец адна заўвага: добра, што гэнае крывое люстра нашае сапраўднасьці ўзяла ў рукі аўтарка з прозьвішчам Добачэвска, інакш гэнае сапраўднасьці ніколі мы і не пабачылі-б з тае прычыны, што ў беларускай вопратцы не прапусьціла-б яе цэнзура.

*1936 г.*

# Каментарыі

Публіцыстычныя артыкулы Станіслава Грынкевіча на эстэтычныя і літаратурныя тэмы друкуюцца паводле часопісаў „Студэнцкая думка” і „Калосьсе”.

Правапіс аўтара захоўваецца.

Творы друкуюцца не ў храналагічным парадку.

З роднае Сакольшчыны

Друкуецца паводле часопіса „Калосьсе”, 1937, № 4, дзе ўпершыню быў апублікаваны.

З зацемак аб характары беларусаў

Друкуецца паводле часопіса „Калосьсе”, 1935, № 2, дзе ўпершыню быў апублікаваны.

З зацемак аб тэатры

Друкуецца паводле часопіса „Калосьсе”, 1935, № 3, дзе ўпершыню быў апублікаваны.

Узгадаваньне характару

Друкуецца паводле часопіса „Студэнцкая думка”, 1928, № 2, дзе ўпершыню быў апублікаваны.

Аб прывычцы ў самаўзгадаваньні

Друкуецца паводле часопіса „Студэнцкая думка”, 1928, № 3, дзе ўпершыню быў апублікаваны.

„Учора” і „сяньня”

Друкуецца паводле часопіса „Калосьсе”, 1938, № 4, дзе ўпершыню быў апублікаваны.

Трагічны крызыс

Друкуецца паводле часопіса „Калосьсе”, 1939, № 2, дзе ўпершыню быў апублікаваны.

Паны „Жолондзі”

Друкуецца паводле часопіса „Калосьсе”, 1936, № 2, дзе ўпершыню быў апублікаваны.

KAMUNIKAT.org